

ШТО ХВАЛЮЕ СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ

МС

КАЛІ ЧАКАЦЬ ГРЫП?



13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 СТУДЗЕНЯ 2024 г.
СЕРАДА
№ 16 (30150)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **Паступленні ў бюджэт Гомельскай вобласці ў 2023 годзе выраслі на 17,4 %.**
- Біржавы тавараабарот Беларусі і Узбекістана ў 2023 годзе вырас у 17 разоў.
- **Беларусь будзе супрацоўнічаць з Манголіяй у галіне племянной жывёлагадоўлі.**
- Сабаленка прабілася ў паўфінал адкрытага чэмпіянату Аўстраліі.
- **Адноўлены чартарныя рэйсы з Гомеля ў Егіпет.**
- Экспарт прадукцыі лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай галіны ва Узбекістан вырас амаль удвая.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАРТЫНЮК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:**

*«Поспех любога прадпрыемства — у сукупнасці кіраўніцкіх рашэнняў, прынятых кіраўнікамі, вопыту калектыву і традыцый, закладзеных на вытворчасці. Важна сачыць за сучаснымі павевамі і тэндэнцыямі, ісці ў нагу з часам і працягваць шукаць новыя рынкі, новыя віды прадукцыі. Адзін кіраўнік не справіцца з такой задачай. Тут важная самааддача і прафесіяналізм калектыву, увага з боку прадстаўнікоў улады».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПІЛЬНАСЦЬ І ЯШЧЭ РАЗ ПІЛЬНАСЦЬ»

### Рашэнне наконт аховы дзяржаўнай граніцы — асаблівае ў сілу абстаноўкі



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы органамі пагранічнай службы ў 2024 годзе. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэта традыцыйнае мерапрыемства, якое паўтараецца з года ў год, але яно вельмі важнае ў сілу той абстаноўкі, якая разгортваецца вакол нашай Беларусі, вакол нашых граніц. «Таму сённяшняе рашэнне наконт аховы дзяржаўнай граніцы мае сваю адметнасць менавіта ў тым, што ў нас асаблівая сітуацыя. На поўдні — вайна. На захадзе — Польшча. Літва, балтыйскія дзяржавы — і таго горш. Падкрэсліваю: і таго горш. Там рыхтуюцца адпаведныя атрады, «палкаводцы» вызначаны, мы іх ведаем. Ведаем «байцоў» гэтых атрадаў, якія гатовыя ваяваць супраць уласнай краіны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму, як я заўсёды кажу ваенным і асабліва міністру абароны, мы не павінны нічога празяваць, па-народнаму кажучы. Ні ў якім разе нельга дапусціць нейкага выпадковага развіцця падзей на нашай граніцы. Таму пільнасць і яшчэ раз пільнасць».**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пакуль адказныя за абарону граніцы нядрэнна выконваюць свае функцыі. На мерапрыемстве прысутнічалі дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, міністр абароны Віктар Хрэнін, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Канстанцін Моластаў і начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Віктар Гулевіч.

Прэзідэнт пацікавіўся, як сёння абстаноўка на граніцы — на зямлі і ў небе. Ахова дзяржаўнай граніцы сёння ўзмоцнена арміяй. Якая функцыя, роля арміі? Як яна там выконваецца, аказваючы падтрымку і садзейнічанне нашым пагранічным войскам?

Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Канстанцін Моластаў далажыў пра абстаноўку на дзяржаўнай граніцы на 23 студзеня. Па яго словах, на латвійскім участку граніцы вырас паток незаконнай міграцыі і супрацьстаянне, якое выяўляецца ў выдварэнні мігрантаў на нашу тэрыторыю. Паводле слоў Канстанціна Моластава, да аховы дзяржграніцы з латвійскага боку разам са штатнымі падраздзяленнямі прыцягнуты таксама ваеннаслужачыя і супрацоўнікі паліцыі гэтай краіны. Прыгранічная тэрыторыя Літвы актыўна выкарыстоўваецца для дыслакацыі падраздзяленняў Узброеных сіл ЗША і Германіі, у 2023 годзе было праведзена каля 12 вучэнняў.

«Значыць, акрамя пагранічнага кантынгенту, яны сцягнулі туды ўзброеныя сілы, і Латвія, і Літва асабліва, у тым ліку і замежныя», — удакладніў Прэзідэнт. — «Асабліва Літва, — адказаў Канстанцін Моластаў. — Германія і ЗША перавважаюць». — «Ваенным трэба мець на ўвазе і трымаць іх, шчыра скажам, у прыцэле», — заўважыў Прэзідэнт.

Па словах Канстанціна Моластава, з напрамку Польшчы нам супрацьстаіць групоўка сіл. Выкарыстоўваючы ўзведзеную агароджу пяціметровай вышыні для сістэм відэаназірання, яны праводзяць штодзённую паветраную разведку. «Мяне інфармуюць мае крыніцы, у тым ліку і пагранічнікі, і ваенныя, аб тым, што гэта агароджа супраць мігрантаў практычна не працуе. Мігранты яе пераадольваюць без праблем», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Старшыня Пагранічнага камітэта падкрэсліў, што гэта праўда, самі палякі ацэньваюць эфектыўнасць свайго плота на 60 працэнтаў, не больш, і мігранты знаходзяць спосабы яго пераадолець.

СТАР. 2

Адзін раён — адзін праект

# Пляцоўка для перспектыўных

### На прадпрыемстве «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» моладзь стварае інавацыйны прадукт

**Івану ПІСЧЫКУ няма яшчэ і 31, а ён ужо галоўны інжынер прадпрыемства — другая асоба пасля дырэктара. І ён не адзіны з моладзі, хто займае тут адказныя пасады. Наогул, прадпрыемстваў, дзе б усімі вытворчымі працэсамі кіравала моладзь, няшмат. А тут увесь касцяк — учарашнія выпускнікі беларускіх ВНУ, якія прыйшлі не на нешта гатовенькае, каб ціхенька адпрацаваць і з'ехаць. Наадварот, менавіта яны будавалі і развівалі сучасную вытворчасць, запускалі лінію і вялі перагаворы па ўсіх кірунках. Таму пасля адпрацоўкі яны не спяшаюцца змяніць месца работы.**




СТАР. 4

Жывіце ў бяспецы

# АБАГРЭЦЦА І НЕ ЗГАРЭЦЬ

### Як пазбегнуць пажараў па прычыне няправільнай эксплуатацыі пячнога ацяплення і электраабсталявання

**Пажары ў жылым фондзе працягваюць успыхваць то ў адным, то ў другім рэгіёне краіны. Ратавальнікі прафесійна спраўляюцца з вогненнай стыхіяй, у прамым сэнсе выцягваюць людзей з таго свету. Аднак не заўсёды ў надзвычайнай сітуацыі ёсць каму выклікаць супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, а чалавеку, каб атруціцца чадным газам, як вядома, дастаткова ўсяго некалькіх хвілін...**



Фота прэс-службы МНС.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

# «ПІЛЬНАСЦЬ І ЯШЧЭ РАЗ ПІЛЬНАСЦЬ»



Фота БелТА.

Віктар ХРЭНІН і Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У 2024 годзе прыярытэтныя намаганні ў ахове граніцы будуць сканцэнтраваны на правядзенні мерапрыемстваў па выяўленні і спыненні выклікаў і пагроз нацыянальным інтарэсам Беларусі ў пагранічнай прасторы, забеспячэнні бязвізавага рэжыму для грамадзян Літвы, Латвіі і Польшчы, далейшым нарошчванні інжынернага ўладкавання дзяржаўнай граніцы. Працягнецца будаўніцтва і ўвод у строй новых комплексаў падраздзяленняў граніцы і аб'ектаў пагранічнай інфраструктуры, далейшае развіццё, аснашчэнне сучасным узбраеннем і тэхнікай манеўраных груп. У прыярытэце і ўдасканаленне баявой, прафесійнай падрыхтоўкі органаў пагранічнай службы, вучэбнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, далейшае развіццё сістэмы падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **У тэму**

## Галоўнае даручэнне — надзейная ахова дзяржаўнай граніцы

У размове з журналістамі **Канстанцін МОЛАСТАЎ** падкрэсліў, што абстаноўка на дзяржаўнай граніцы і ў пагранічнай прасторы на сёння стабільна напружаная. «Тыя ваенныя выклікі, якія ідуць з усіх сумежных краін, мы бачым і своечасова на іх рэагуем. Сумесна з Міністэрствам абароны, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі, Міністэрствам унутраных спраў гатовы забяспечваць нацыянальную бяспеку ў тым ліку і пагранічнай сферы», — запэўніў ён.



Канстанцін МОЛАСТАЎ.

Сёння паблізу ад беларускай граніцы сканцэнтравана групоўка ўзброеных фарміраванняў Украіны. Уздоўж нашых рубяжоў працягваюць актыўна ўзводзіцца мінныя палі, розныя інжынерныя збудаванні і загароды. Вядзецца разведка беларускай тэрыторыі з выкарыстаннем розных тэхнічных сродкаў і беспілотных лятальных апаратаў. У гэтых умовах беларускія пагранічнікі працягваюць несці службу на паўднёвым напрамку ва ўзмоцненым рэжыме. Старшыня Пагранічнага камітэта падкрэсліў, што на гэтым участку граніцы абстаноўка такая ж, як была і ў мінулым годзе. «Украіна ў аснову паклала прымяненне абарончых пазіцый, у тым ліку і ў пунктах пропуску, якія цяпер не дзейнічаюць. Глыбока эшаланіраванае размяшчэнне узбуйненых мабільных пагранічных атрадаў», — адзначыў Канстанцін Моластаў. Што датычыцца правакацый на ўкраінскім участку граніцы, то, па словах старшыні пагранічнага ведамства, іх колькасць, у тым ліку з прымяненнем беспілотных лятальных апаратаў, значна знізілася.

У мінулым годзе на мяжы з Латвіяй значна вырасла колькасць спробаў выцяснення бежанцаў, якія суправаджаюцца грубым ужываннем сілы з боку латвійскіх сілавікоў. Зафіксаваны 43 смерці і мноства зраненых іншаземцаў, шпіталізаваных у беларускія ўстановы аховы здароўя. Прыгранічная тэрыторыя Літвы актыўна выкарыстоўваецца для дыслакацыі падраздзяленняў Узброеных сіл ЗША і Германіі. На палігоне «Пабрадэ» на пастаяннай аснове праводзяцца розныя вучэнні аператыўна-тактычнага ўзроўню. З боку Польшчы засяроджана групоўка сіл і сродкаў, якая складаецца з пагранічнай аховы, узброеных сіл і паліцыі. На працягу мінулага года тут адзначаліся шматлікія спробы выцяснення замежнікаў, а таксама перамяшчэння на беларускую тэрыторыю збітых і загінулых ад ран бежанцаў.

Канстанцін Моластаў расказаў, што асноўнае даручэнне Прэзідэнта да органаў пагранічнай службы — надзейная ахова дзяржаўнай граніцы ў сённяшніх умовах.

**Начальнік Генеральнага штаба Узброеных сіл — першы намеснік міністра абароны Віктар ГУЛЕВІЧ** расказаў, што групоўка ваенна-паветраных сіл краін НАТА, якая засяроджана каля нашай дзяржаўнай граніцы, стварае дадатковыя выклікі і пагрозы на граніцы ў паветранай прасторы. «Узброеныя сілы прыкладваюць дадатковыя меры па нарошчванні радыёлакацыйнага поля, сіл сродкаў радыётэхнічных войскаў, сіл сродкаў радыёэлектроннай барацьбы, якія могуць паспяхова праводзіць мерапрыемствы па выяўленні суднаў парушальнікаў і па ўздзеянні на іх», — сказаў ён. Віктар Гулевіч адзначыў, што колькасць правакацый у паветранай прасторы захавалася на ранейшым узроўні. «Неабходна адзначыць, што насычэнне нашых радыётэхнічных войскаў новымі ўзорамі як айчыннай вытворчасці, так і паступіўшых з Расійскай Федэрацыі, павышае магчымасці нашых войск ваенна-паветранай абароны па ўскрыцці спроб такіх правакацый і магчыма выпадковых парушэнняў. Мы можам гэта адсочваць, дакументіраваць і прад'яўляць нашым сумежным краінам, якія, хочацца верыць, робяць гэта выпадкова, а не наўмысна», — падкрэсліў начальнік Генеральнага штаба.

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

# «Падрыхтоўка да выбараў ідзе спакойна і без эксцэсаў»

### На пасяджэнні Цэнтрвыбаркама разгледзелі бягучыя пытанні, якія датычацца выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання

**Сярод іх — арганізацыя галасавання беларускіх грамадзян, якія пражываюць за мяжой, размеркаванне бясплатнага эфірнага часу для выступленняў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання па тэлебачанні і радыё. Акрамя таго, зацверджаны метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і правядзенні выбараў у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання і Усебеларускі народны сход, вызначаны склад навукова-экспертнага савета пры Цэнтральнай выбарчай камісіі.**

Як расказаў у размове з журналістамі **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА**, у навукова-экспертны савет пры ЦВК уваходзяць людзі, якія маюць пэўныя навуковыя дасягненні ў галіне права, уключаючы выбарчае і канстытуцыйнае, і якія будуць дапамагаць Цэнтральнай выбарчай камісіі займацца аналізам выканання заканадаўства пры правядзенні выбараў.



Фота БелТА.

«Пасля кожнай выбарчай кампаніі мы аналізуем, як на практыцы прымяняліся тыя ці іншыя нормы, — канкрэтызаваў ён. — Разглядаем гэтыя пытанні, уносім пэўныя прапановы суб'ектам заканадаўчай ініцыятывы для таго, каб удасканальваць выбарчае заканадаўства». Пры гэтым Ігар Карпенка звярнуў увагу, што ўдасканаленне выбарчага заканадаўства з'яўляецца адным з элементаў удасканалення выбарчай сістэмы, якая не стаіць на месцы, а развіваецца разам з нашай дзяржавай, а таксама разам з тымі палітычнымі працэсамі, якія адбываюцца як унутры нашай краіны, так і на знешнім контуры.

Старшыня Цэнтрвыбаркама падкрэсліў, што падрыхтоўка да выбараў ідзе спакойна і без эксцэсаў, у адпаведнасці з устаноўленым каляндарным планам. «Мы знаходзімся на этапе рэгістрацыі патэнцыяльных кандыдатаў у дэпутаты ўсіх узроўняў, — адзначыў Ігар Карпенка. — Гэты працэс завершыцца 30 студзеня. З 31 студзеня да 24 лютага ўключна пройдзе этап агітацыі».

На дадзены момант зарэгістравана 4439 нацыянальных назіральнікаў: «Але гэта толькі ў тэрытарыяльных акруговых камісіях, — удакладніў старшыня ЦВК. — Цяпер ідзе працэс фарміравання ўчастковых выбарчых камісій, у агульнай колькасці іх створана 5411. І, вядома ж, пры ўчастковых камісіях таксама будуць нацыянальныя назіральнікі — гэта значыць, што лічба можа вырасці ў разы».

Па стане на 22 студзеня зарэгістравана 58 міжнародных назіральнікаў. Работу штаба доўгатэрміновых назіральнікаў адкрыла сустрэча Ігара Карпенкі з кіраўніком місіі назіральнікаў ад СНД, генеральным сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым, якая адбылася напярэдадні. Па меркаванні Цэнтрвыбаркама, міжнародных назіральнікаў будзе даволі шмат. Рыхтуецца каля 300 пакетаў дакументаў, каб назіральнікі адчувалі сябе ў Беларусі камфортна і маглі свабодна ўдзельнічаць у працэсе назірання за адзіным днём галасавання.

У Цэнтральную выбарчую камісію паступіла ўжо каля 200 вусных зваротаў грамадзян. Па словах Ігара Карпенкі, большасць з іх звязаны з удакладненнем неабходных дакументаў на тых ці іншых стадыях выбарчай кампаніі, прымяненнем той ці іншай нормы выбарчага заканадаўства. Акрамя таго, зарэгістраваны звароты, якія не адносяцца да кампетэнцыі ЦВК: людзі просяць дапамогі ў рамонце даху або дарогі. Такія звароты адпраўляюцца ў мясцовыя кампетэнтныя органы. Без увагі не застаецца ні адзін зварот, які трапляе ў Цэнтрвыбаркам.

Што датычыцца галасавання нашых грамадзян, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з абноўленым заканадаўствам, выключана норма аб правядзенні галасавання за мяжой. «Па ўзгадненні з Міністэрствам замежных спраў і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам намі прынята рашэнне аб тым, што для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія афармілі пастаяннае пражыванне на тэрыторыі іншай дзяржавы, будзе вызначаны адзін участак, на якім такая катэгорыя нашых грамадзян зможа прыехаць у краіну і прыняць удзел у галасаванні па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусі, — паведаміла **сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі Алена БАЛДОЎСКАЯ.** — Чаму толькі Палаты прадстаўнікоў? У адпаведнасці з Канстытуцыяй, дэпутатаў мясцовых Саветаў выбіраюць жыхары адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі».

Для галасавання грамадзян, якія пастаянна пражываюць за мяжой, вызначаны ўчастак № 248, які размешчаны на тэрыторыі горада Мінска па адрасе: вуліца Свярдлова, 30 (на базе гімназіі № 75 імя Масленікава). Што датычыцца катэгорыі грамадзян, якія пражываюць за мяжой, але маюць рэгістрацыю па месцы знаходжання на тэрыторыі нашай краіны, то яны будуць уключаны ў спісы для галасавання па месцы рэгістрацыі. І тыя, і другія змогуць атрымаць бюлетэні, прад'явіўшы пашпарт, ідэнтыфікацыйную карту або біяметрычны пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

**Вераніка КАНЮТА.**

# Навукоўцы павінны зазіраць за гарызонт...

**Нягледзячы на санкцыі Захаду, Нацыянальная акадэмія навук актыўна развівае супрацоўніцтва з многімі краінамі і паспяхова вядзе работу па розных кірунках.**

Як адзначыў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**, поспехі ў атамнай энергетыцы, распрацоўкі ў сферы медыцыны і стварэнне лінейкі айчыннага электратранспарту можна лічыць прарыўнымі для беларускіх навукоўцаў.

Закранаючы вынікі работы Нацыянальнай акадэміі навук у 2023 годзе, Уладзімір Гусакоў нагадаў, што галоўнымі крытэрыямі працы вучоных з'яўляюцца дынаміка беларускай эканомікі і гарманічнае развіццё сацыяльнай сферы. НАН Беларусі як вышэйшая навуковая арганізацыя краіны ў мінулым годзе працягвала ажыццяўляць навуковае забеспячэнне і суправаджэнне больш як 35 праграм, у тым ліку ў сферы фундаментальных даследаванняў, навукова-тэхнічных і галіновых.

Кіраўнік Акадэміі навук адзначыў, што было забяспечана дасягненне ўсіх мэтавых паказчыкаў, а па шэрагу індыкатараў айчынныя распрацоўшчыкі спрацавалі на апераджэнне. Тым самым павышаецца планка выніковасці сваёй уласнай фундаментальнай і прыкладной навукі. А ў сучасных умовах грань паміж гэтымі буйнымі кампанентамі становіцца практычна незаўважнай.

## Месяцавая праграма і лінейка электрамабіляў

У топ-10 дасягненняў нашай навукі ўваходзяць распрацоўкі шырокага спектра: ад звышмоцных электрычных палёў і прымяненне ніобіевых рэзанатараў да супрацьвіруснай і процівухлiннай тэрапіі. У структуры НАН звыш 100 вытворчасцяў. Навука цяпер цесна інтэграваная ў беларускую эканоміку.

Уладзімір Гусакоў падкрэсліў, што Акадэмія навук узаемадзейнічае са 100 краінамі — ад Кітая, Індыі і Кубы да Заходняй Еўропы, Японіі і ЗША. Пры Акадэміі функцыянуюць 48 міжнародных даследчых цэнтраў. Толькі за мінулы год яе наведалі дэлегацыі з 40 краін.

Як вынік — развіццё сумесных праектаў. У кастрычніку мінулага года НАН Беларусі і Кітайская нацыянальная касмічная адміністрацыя падпісалі дэкларацыю аб супрацоўніцтве ў працэсе стварэння і эксплуатацыі Міжнароднай навуковай месяцавай станцыі. Профільныя інстытуты НАН ужо ўзаемадзейнічаюць з аналагічнымі кітайскімі структурамі.

«Мы ўключыліся ў месяцавую праграму. Гэта вельмі важна. І паказальна, што Кітай прапанаваў такое супрацоўніцтва невялікай краіне — Беларусі», — акцэнтаваў увагу Уладзімір Гусакоў.

Асобныя распрацоўкі беларускіх навукоўцаў пераўзыходзяць сусветны ўзровень. Адзін з прыкладаў — выкарыстанне хімерных антыгенных рэцэптараў малекул РНК, якія вучаць імунныя клеткі пацыента змагацца з ракавымі пухлінамі. Распрацоўка выкарыстоўваецца пры правядзенні CAR-T-клетачнай тэрапіі лейкозаў у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава.

Важна не стаяць на месцы. НАН сфармавала рэестр перспектыўных праектаў, які ўключае ўжо 81 прапанову. Адно з першачарговых — стварэнне сеткі мабільнай электрасувязі 5G. Распрацавала Акадэмія навук і лінейку электрамабіляў рознай мадыфікацыі і прызначэння, у ліку якіх мадэль легкавушкі з максімальнай ступенню лакалізацыі па асноўных кампанентах. Створаны цэнтр кампетэнцый, які рэалізоўваецца ў краіне з нуля. Як чакаецца, вытворчасць айчыннага электрамабіля запусцяць да 1 студзеня 2025 года.

## І сябе паказаць, і выгадна пагандляваць

Пад эгідай НАН за мінулы год праведзена 26 выставачных мерапрыемстваў, падпісана 80 пратаколаў і 450 кантрактаў. «Мы цяпер дамаўляемся аб абмене распрацоўкамі з Акадэміяй навук Кітая: прадстаўім у іх свае распрацоўкі, а кітайскія навукоўцы прадставяць свае дасягненні ў нашай краіне. Плануецца зрабіць гэта ўжо вясной».

Уладзімір Гусакоў падкрэсліў, што выставачная дзейнасць — гэта вельмі выгадна. На рубель выдаткаў краіна атрымала 16 долараў даходу па заключаных дагаворах і кантрактах.

Кіраўнік НАН таксама заўважыў, што выстава «Беларусь інтэлектуальная», якая прайшла ў пачатку 2023 года, выклікала шырокі рэзананс. «Пасля правядзення «Беларусі інтэлектуальнай» у Мінску і рэгіёнах да нас пачалі ехаць цэлыя дэлегацыі з абласцей, з прадпрыемстваў і арганізацый, — расказаў Уладзімір Гусакоў. — У Нацыянальнай акадэміі навук таксама ёсць пастаянна дзеючая выстава — наведванні працягваюцца дагэтуль. Мы пастаянна абнаўляем экспазіцыю, прадстаўляючы найноўшыя распрацоўкі».

На думку старшыні Прэзідыума НАН, своеасаблівым працягам «Беларусі інтэлектуальнай» стала экспазіцыя, якая адкрылася ў лістападзе ў павільёне Беларусі на ВДНГ у Маскве, дзе прадстаўлены некаторыя з паказаных раней у нас экспанатаў — касмічныя, авіятэхнічныя, навуковыя распрацоўкі, а таксама ўвасобленыя праекты беларускага машынабудавання — ад мадэляў да рэальных машын. Характэрна, што айчынная экспазіцыя выклікала вялікую цікавасць — за два месяцы работы выставы яе наведалі больш за 215 тысяч чалавек. Уладзімір Гусакоў дадаў, што пасля Масквы пры наяўнасці цікавасці экспазіцыю можа з часам дэманстравацца і ў іншых расійскіх рэгіёнах.

## Калі інвестыцыі працуюць

Па стане на снежань 2023 года ў Беларусі было акрэдытавана ў якасці навуковых арганізацый 224 юрыдычныя асобы. Пра гэта паведаміў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ.**

У ажыццяўленні навуковых даследаванняў і распрацовак удзельнічалі больш чым 25 тысяч чалавек, з якіх крыху больш за 500 дактароў навук і прыкладна 2500 кандыдатаў навук. У рамках праграмы інавацыйнага развіцця выконваецца 68 інавацыйных праектаў.

У галіне машынабудавання гэта новыя мадэлі камбайнаў, новыя інтэгральныя мікрасхемы, у галіне аховы здароўя — новыя метады лячэння з выкарыстаннем 3D-тэхналогій, у аграпрамысловым комплексе — новыя сарты раслін і пароды жывёл. А таксама новыя тэхналогіі і прадукцыя харчовай прамысловасці. Гэты спіс можна працягваць доўга.

Па папярэдніх даных за мінулы год, у навукова-тэхнічнай дзейнасці за 1 рубель інвестыцый у сярэднім рэалізавана прадукцыі на 11 рублёў, у інавацыйнай дзейнасці на 1 рубель інвестыцый рэалізавана прадукцыі на 15,5 рубля. Экспарт склаў 6 рублёў, з іх высокатэхналагічны — 4,2 рубля.

Практычна ўсе вядомыя ў свеце паказчыкі, якія характарызуюць узровень інавацыйнага развіцця дзяржавы, у нас знаходзяцца ў станоўчай дынаміцы, усе яны выкананы.

Да канца мінулага года ў краіне дзейнічала 17 тэхналагічных паркаў, колькасць рэзідэнтаў у іх дасягнула 260. Аб'ём выраблена гэтымі рэзідэнтамі прадукцыі склаў больш за 450 мільёнаў рублёў — рост гэтага паказчыка ў шэсць разоў з 2016 года.

Сяргей Шлычкоў таксама праінфармаваў, што 26 студзеня ў Нацыянальнай бібліятэцы з 10 раніцы пачне работу выстава навуковых дасягненняў Беларусі. Там будуць прадэманстраваны больш за 280 распрацовак ад 80 навуковых арганізацый нашай краіны.

## Вакцыны супраць грыпу і не толькі

На аснове найноўшых біятэхналогій акадэмічнымі навукоўцамі ўпершыню створаны прататыпы дзвюх айчынных вакцын супраць грыпу, расказаў Уладзімір Гусакоў.

Беларускія навукоўцы вядуць работы па розных кірунках, уключаючы распрацоўку фармацэўтычных прэпаратаў.


Фота БелТА.

У навукова-вытворчым цэнтры біятэхналогій НАН Беларусі.

«У галіне медыцыны і фармакалогіі на аснове найноўшых біятэхналогій акадэмічнымі навукоўцамі ўпершыню створаны прататыпы дзвюх айчынных вакцын супраць грыпу, чаго раней ніколі не было. Адна з іх інактываваная культуральная, другая рэкамбінантная з антыгенамі вірусаў з раслін», — сказаў Уладзімір Гусакоў.

Гэта не ўвесь спіс дасягненняў навукоўцаў. Паводле яго слоў, таксама былі распрацаваны і ўкаранёны ў практыку новыя тэхналагічныя працэсы для высокадакладнага сінтэзу бялку, у прыватнасці, атрыманы эксперыментальныя ўзоры прэпарату для лячэння ішэміі ніжніх канечнасцяў на аснове ДНК плазмід.

Вялікім прарывам летась стала распрацоўка навукоўцаў разам з беларускімі ўрачамі-анколагамі па барацьбе з ракам. Гаворка ідзе пра канструкцыі хімерных антыгенных рэцэптараў малекул-РНК, якія вучаць імунныя клеткі пацыента змагацца з ракавымі пухлінамі.

**Першы намеснік міністра аховы здароўя Беларусі Алена КРАТКОВА** распавяла, што CAR-T тэрапія дазваляе дарослым і дзецям змагацца з агрэсіўнымі формамі ў клетачных лімфах, якія не ўспрымальныя да звычайнага процiпухліннага лячэння.

«Вопыт прымянення ў 10 дзяцей паказвае 85-працэнтную выжывальнасць, гэта вельмі высокі працэнт. У дарослых ён выкарыстоўваўся ў 27 пацыентаў», — удакладніла яна.

Намеснік міністра адзначыла, што навуковыя даследаванні беларускіх вучоных-медыкаў вядуцца з улікам магчымасці прымянення атрыманых вынікаў у практычнай дзейнасці.

«Асаблівасць Беларускай медыцынскай навукі — яе практыка-арыентаванасць, — сказала яна. — У цяперашні час у краіне рэалізоўваецца больш за 350 навуковых праектаў, вынікам якіх у мінулым годзе стала распрацоўка 128 новых метадаў дыягностыкі і лячэння, якія ўжо рэалізаваны актамі ўкаранення і публікацыямі». Алена Краткова таксама пазначыла асноўныя кірункі ў ахове здароўя, якія з'яўляюцца прыярытэтамі для навуковых даследаванняў. Першы — праблемы ў галіне медыцынскіх біятэхналогій, у тым ліку ў рамках рэалізацыі Канцэпцыі нацыянальнай сістэмы забеспячэння біялагічнай бяспекі. Другі — распрацоўка лекавых сродкаў, дыягнастычных прэпаратаў, тэст-сістэм. Трэці — пытанні аховы мацярынства і дзяцінства. Чацвёрты — метады прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння анкалогіі. Пяты — захворванні сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм.

Прадстаўнік Міністэрства аховы здароўя таксама адзначыла, што ў 2023 годзе ў краіне было зарэгістравана 46 айчынных лекавых прэпаратаў. Прычым кожны трэці зарэгістраваны летась лекавы прэпарат з'яўляўся айчынным. Як і кожны пяты з 417 вырабаў медыцынскага прызначэння.

У сістэме Міністэрства аховы здароўя налічваецца 25 навуковых арганізацый, працуе больш за 2500 медыцынскіх работнікаў з навуковай кваліфікацыяй, з якіх 387 — дактары медыцынскіх навук. Штогод больш за 17 працэнтаў ад усіх дысертацый, якія абараняюцца ў Беларусі, адносяцца да медыцынскага профілю. Мінулы год не стаў выключэннем: абаронена 87 дысертацый, з якіх 67 — на саісканне кандыдата медыцынскіх навук і 19 — на саісканне ступені доктара медыцынскіх навук.

## Нобелеўскі камітэт... ён у Швецыі засядае

Уладзімір Гусакоў лічыць, што ў краіне ёсць патэнцыяльныя прэтэндэнты на Нобелеўскую прэмію. Аднак, на яго думку, крытэрыі прысуджэння ўзнагароды цяпер залішне палітызаваныя, таму рэальныя шанцы на яе атрыманне беларусамі невялікія.

«У нас нават былі спробы прабіцца, не буду казаць з кім, але гэта немагчыма, паколькі Нобелеўскі камітэт у Швецыі засядае, і ён настолькі палітызаваны, і там чарговасць на некалькі гадоў наперад — каго яны ўжо абяруць. Ужо чарга ўсталявалася, нас пакуль у гэтай чарзе няма», — падзяліўся сваім меркаваннем кіраўнік НАН.

Уладзімір Гусакоў таксама лічыць, што ў нашай краіне ёсць «па статусе, па значнасці, па распрацоўках, па маштабнасці, па ахопе працы абсалютна прыдатныя пад Нобелеўскую прэмію» навукоўцы і даследчыкі.

«Але цяпер Нобелеўская прэмія вельмі палітызаваная і нават прыватызаваная амерыканцамі. Вы паглядзіце: асноўныя лаўрэаты — гэта амерыканцы альбо з амерыканскім удзелам», — падкрэсліў старшыня Нацыянальнай акадэміі навук. З яго слоў, заснавальнікі прэміі ігнаруюць сёння нават прадстаўнікоў Расіі і Кітая.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Фінляндыі значна ўзрасла колькасць рабаванняў

Летась у Фінляндыі на 18 працэнтаў павялічылася колькасць рабаванняў у параўнанні з папярэднім годам. Пра гэта паведаміла тэлерадыёкампанія Yle.

Паводле даных Статыстычнага цэнтра краіны, у мінулым годзе паліцыя атрымала паведамленні аб 2,8 тысячы рабаванняў. Больш за ўсё такіх злачынстваў зафіксавана ў паліцэйскіх акругах Оўлу, Унутраная Фінляндыі, Хяме і Паўднёва-Заходняй Фінляндыі. Рабаванні класіфікуюць як крадзяжы з ужываннем гвалту ці пагрозы гвалту. Да злачынстваў, звязаных з рабаваннем, таксама адносяцца выпадкі вымагальніцтва.

У мінулым годзе па ўсёй краіне было зарэгістравана 43 тысячы злачынстваў супраць жыцця і здароўя, што на 6,5 працэнта больш, чым у 2022 годзе. З іх 62 — забойствы.

## Прэм'ер-міністр Індыі адкрыў велічны храм у гонар бога Рамы

Нарэндра Модзі ўзначаліў асвячэнне велічнага храма індуісцкага бога Рамы ў горадзе Аёдх'я (штат Утар-Прадэш). Аб гэтым паведаміла India Today. У горад прыбылі дзясяткі тысяч паломнікаў з усёй Індыі, каб прыняць удзел ва ўрачыстасцях. Як паведаміла BBC, Нарэндра Модзі адзначыў, што адкрыццё храма азнаменавала «новую эру» для Індыі, гэты дзень «увойдзе ў гісторыю». Сярод гасцей мерапрыемства ў Аёдх'і былі вядучыя кіназоркі. Храм быў пабудаваны за $217 млн на прыватныя ахвяраванні. Адкрыты толькі яго першы паверх, астатнія ўзроўні плануецца здаць да канца 2024 года. Будаўнічыя работы з'яўляюцца часткай рэканструкцыі горада Аёдх'я, кошт якой ацэньваецца больш як у $3 млрд. Храм у Аёдх'і ўзведзены на месцы мячэці Бабры Масджыд, якая стаяла там, дзе, паводле міфаў, нарадзіўся Рама — зямное ўвасабленне бога Вішну. Мячэць была знесена ў 1992 годзе. У 2019-м Вярхоўны суд Індыі адобрыў узвядзенне храмавага комплексу Рам Джанмабхумі.



# Пляцоўка для перспектыўных

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### КАМАНДНЫ ЗАЛІК

Сярэдні ўзрост працаўнікоў на прадпрыемстве з ліку інжынерна-тэхнічнага персаналу — 30—35 гадоў. Так атрымалася, што пачатак іх працоўнай дзейнасці прыпаў на той складаны перыяд, калі з-за санкцый уводзіліся абмежаванні і трэба было ўсе свае веды, навыкі, амбіцыі накіраваць у адно рэчышча. Яны сталі першапраходцамі, і ў іх усё атрымалася. Той жа Іван Пісчык трапіў сюды пасля Магілёўскага Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (БРУ) у якасці інжынера. Ужо праз два гады, калі пачаліся будаўнічыя работы запуску лініі па вытворчасці мармеладу, стаў галоўным інжынерам. Пад яго кіраўніцтвам ажыццяўлялася рэалізацыя вытворчасці інавацыйных кандытарскіх вырабаў.

— Супрацоўнічаў з праектнай арганізацыяй «Белгіпрааграхарчпрам», быў у камандзе кіраўнікоў пры заключэнні кантракта з нямецкім бокам, — успамінае Іван той перыяд. — Каардынаваў будаўніцтва, запускаў лінію — адным словам, вёў аб'ект ад заключэння кантракта і да яго ўводу ў эксплуатацыю. Пусканаладачныя работы праводзіліся пад кіраўніцтвам нямецкіх спецыялістаў, але адпрацоўка новых відаў кандытарскіх вырабаў ажыццяўлялася ўжо нашай камандай. На этапе праектавання займаўся арганізацыяй вытворчасці мёду. Але самы сур'ёзны этап — менавіта арганізацыя інавацыйнай вытворчасці. Сёння мы маем 40 відаў мармеладнай прадукцыі.

Інавацыйнасць праекта ў тым, што «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» стварае цалкам новы мармеладны прадукт — з вітамінамі, дыябетычны, нізкавугляводны на аснове айчыннай біялагічна каштоўнай раслiннай сыравіны, для харчавання пры інтэнсіўных фізічных нагрузках. Існуе аналаг імпартнай «Шалёнай пчолкі» — тут гэта «Залатая пчолка» з рознымі начыннямі, а таксама «чарвячкі», «мішкі», «пінгвіны», як у вядомага замежнага брэнда. Прадпрыемства выкарыстоўвае ў рабоце сучасныя формы, сюды прыязджаюць арганізаваныя групы паглядзець, як ствараецца смачны прадукт. Аб'ект цікавы з пункту гледжання прамысловага турызму. Бо дзе, як не тут, заахвочваць моладзь на выбар вельмі патрэбных для рэгіёна прафесій. І вельмі важна пачуць карысную інфармацыю з вуснаў таксама маладых.

— Каб быць у першых радах, заўсёды трэба развівацца, — лічыць Іван. — Летась ездзілі ў Кітай, былі на прадпрыемстве па вытворчасці падобнай прадукцыі. Адчуванне, што мы ў чымсьці адстаём, не ўзнікала. У нас таксама ўсё накіравана на аўтаматызацыю працэсаў. Гэта прымушае ўдасканальвацца і шмат працаваць. Цяпер здаю сесію ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, атрымліваю карысныя для сябе веды.



**Моладзь прадпрыемства паступова ўключаецца і ў актыўнае грамадскае жыццё раёна. Некалькі з іх уваходзяць у Маладзёжны парламент. Магчыма, калі голас маладых будзе гучаць больш гучна і настойліва, у культурным жыцці невялікага раённага цэнтра адбудуцца змены да лепшага.**

### МАЛАДЫЯ, ЦІКАЎНЫЯ, ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ

У Слаўгарад Іван пераехаў разам з жонкай Веранікай. Яна інжынер па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні і метралогіі, паралельна старшыня прафсаюзнай пярвічкі і член Маладзёжнага парламента. Дзяўчына родам з Оршы, з Іванам, які, дарэчы, ураджэнец Бабруйска, пазнаёміліся падчас вучобы ў БРУ. І ў Слаўгарад паехалі па размеркаванні.

— Прадпрыемства маладое, цікавае, перспектыўнае, — расказвае яна. — Прыйшлі з мужам, калі яно толькі ўтварылася і ўсё было ў зачаткавым стане. Мы ездзілі ў Бабруйск на галаўное прадпрыемства пераймаць вопыт. А калі пачаліся праекты, вярнуліся ў Слаўгарад.

Як прафсаюзны лідар Вераніка стараецца напоўніць жыццё калектыву прыемнымі падзеямі. Летась, напрыклад, ездзілі ў Сулу — інтэрактыўны гістарычны аб'ект пад Мінскам. А ў снежні дапамагла калегу аформіць пуцёўку ў санаторый «Прыдняпроўскі». Новы год калектыў адзначаў разам. Усе супрацоўнікі атрымалі падарункі. Дзяўчына адсочвае і канцэртную афішу. Калі нехта з артыстаў прыязджае, браніруе для ахвотных білеты.

### «МЯДОВЫ» ВЫБАР

Сёння на прадпрыемстве працуе 116 чалавек. А пачыналася ўсё з 30. Штат, між тым, папаўняецца маладымі спецыялістамі. Напрыклад, сёлета прыйшлі два новыя тэхнолагі. Цяпер яны працуюць пад кіраўніцтвам галоўнага тэхнолага Алены Данілковіч. Сама яна выпускніца Беларускага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій, на «Чырвоны харчавік» прыйшла пасля размеркавання ў 2020 годзе.

— З прадпрыемствам пазнаёмілася, калі праходзіла пераддыпломную практыку ў Бабруйску, — адзначае яна. — Там жа пачынала працаваць, але пасля запуску лініі мёду ў Слаўгарадзе пераехала ў райцэнтр. Займаемся распрацоўкай новых рэцэптур і ўкараненнем іх на вытворчасці. На сёння ў рабоце 63 рэцэптуры, у далейшым лінейка мармеладу будзе пашырана зыходзячы як з магчымасцяў прадпрыемства, так і попыту на рынку.

Алена родам з Міншчыны, Любанскага раёна, але часта бываць дома не даводзіцца. Работа напружаная, акрамя распрацоўкі рэцэптур яна яшчэ кантралюе тэхналагічныя параметры вытворчасці мармеладу і работу зменных тэхнолагаў.

Працоўны дзень з 8 раніцы да паловы пятай, але не заўсёды атрымліваецца ўкласціся ў гэтыя рамкі. Бывае, што з работы ідзеш, калі стрэлкі на гадзінніку паказваюць восем вечара, прызнаецца галоўны механік Віктар Дзічко. Ён таксама выпускнік Беларускага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій, на прадпрыемстве з лютага 2018 года. Каля трох гадоў працаваў у Бабруйску, а потым удзельнічаў у запуску «мядовай» лініі ў Слаўгарадзе, пасля чаго тут і застаўся. Хаця, прызнаецца, у зарплаце адчувальна страціў. Для райцэнтра, маўляў, яна высокая, а вось для абласнога цэнтра ўжо не.

— У цэлым нядрэнна, — кажа ён. — Работа цікавая, летась быў на міжнароднай аграпрамысловай выставе ў Маскве, глядзеў тэхналагічнае абсталяванне. Шукалі партнёраў па камплектуючых часцях, нашы дзяўчыны — кампаньёнаў па сыравіне. Добрыя кантакты наладжаны з пастаўшчыкамі тэхналагічнага абсталявання з Омска. Яны да нас прыязджалі, мы ездзілі да іх. Усё гэта дапамагае трымаць форму, не адрывацца ад часу.

Начальнік вытворчай лабараторыі Алеся Шажкова на прадпрыемстве з 2021 года, прыйшла па размеркаванні пасля заканчэння Беларускага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій. Пачынала з інжынера па стандартызацыі і сертыфікацыі. На новай пасадзе ўжо год. Летась ездзіла ад прадпрыемства ў Санкт-Пецярбург на курсы павышэння кваліфікацыі. Гэта адзін з плюсаў работы, які дае магчымасць расці і развівацца, лічыць яна.

— У нас працуе цудоўная каманда, — адзначае дырэктар прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» Віктар Пташыц. — Кожны чалавек на сваім месцы, гэта людзі, якім можна давяраць. Работа ў нас напружаная, але цікавая. У хуткім часе плануем выйсці на поўную магутнасць — выраб трох тысяч тон смачнай прадукцыі.

**Інавацыйнасць праекта ў тым, што «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» стварае цалкам новы мармеладны прадукт — з вітамінамі, дыябетычны, нізкавугляводны на аснове айчыннай біялагічна каштоўнай раслiннай сыравіны, для харчавання пры інтэнсіўных фізічных нагрузках. Існуе аналаг імпартнай «Шалёнай пчолкі» — тут гэта «Залатая пчолка» з рознымі начыннямі, а таксама «чарвячкі», «мішкі», «пінгвіны», якую вядомага замежнага брэнда.**

— Плюс у тым, што тут працуе шмат моладзі, — дадае намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Наталля Халімава. — Значыць, вытворчасць будзе развівацца. Сярэднямесячная зарплата тут адна з найвышэйшых у раёне — складае 1350 рублёў. За лістапад — студзень прадпрыемства экспартавала прадукцыі на суму амаль 800 тысяч долараў у Расію, Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Арменію і Малдову. Прапрацоўваецца магчымасць паставак у Грузію і Кітай. Слаўгарадскі мармелад запатрабаваны.

### НЕ ХАПАЕ КАМФОРТУ ЦІ ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦІ?

Прадпрыемства забяспечыла ўсіх маладых спецыялістаў арэндным жыллём. Усе мае суразмоўнікі жывуць у адным доме ў новым мікрараёне Маладзёжны. Пад іх вокнамі — дзіцячы садок. І гэта таксама добры стымул для таго, каб затрымацца ў горадзе. Работа цікавая, прадпрыемства перадавое, калектыў сяброўскі, дырэктар малады і да кожнага ставіцца з разуменнем — гэта тыя плюсы, якія цэняць моладзь. Адзінае, чаго ёй не хапае, — умоў для больш разнастайнага адпачынку. У райцэнтры ёсць кінатэатр, але яго рэпертуар маіх суразмоўцаў не задавальняе. Ёсць кавярня ад райспажыўкааперацыі, але яе фармат не маладзёжны. На ўвесь горад з буйных рытэйлераў — адзін «Еўраопт». Ім хочацца больш. Мясцовы Цэнтр культуры не ў стане канкурыраваць з гарадскімі забаўляльнымі пляцоўкамі. Таму маладыя бацькі ў выхадныя дні возяць сваіх дзяцей у магілёўскія гульнявыя паркі. І пасля сыходу са Слаўгарада перавозчыка, маршруткі якога курсіравалі паміж райцэнтрам і Магілёвам ледзь ні кожную гадзіну, засумавалі...

Старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана Язерская лічыць, што палепшыць якасць жыцця ў горадзе можна з дапамогай грамадзянскіх ініцыятыў. Раённыя дэпутаты разам з мясцовай моладдзю падрыхтавалі сумесна дзве ініцыятывы, якія, калі іх падтрымаюць на абласным узроўні, дапамогуць развіць набярэжную ў раёне зоны адпачынку на месцы зліцця Сожа і Проні і зрабіць больш прывабным слаўгарадскі старажытны парк.

Дарэчы, моладзь прадпрыемства паступова ўключаецца і ў актыўнае грамадскае жыццё раёна. Некалькі з іх уваходзяць у Маладзёжны парламент. Магчыма, калі голас маладых будзе гучаць больш гучна і настойліва, у культурным жыцці невялікага раённага цэнтра адбудуцца змены да лепшага.



**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара**
**і з архіва прадпрыемства.**
*г. Слаўгарад.*

# АБАГРЭЦЦА І НЕ ЗГАРЭЦЬ



Наступства пажара, які адбыўся з-за няправільнай эксплуатацыі печы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прычына большасці пажараў, якія фіксуюцца апошнім часам, — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні. З-за гэтага — і найбольшая колькасць лятальных выпадкаў. Аднак не толькі непатушаная цыгарэта становіцца прычынай узгарання. Да трагічных наступстваў прыводзяць няспраўныя электрасеткі, электраабсталяванне, іх няправільная эксплуатацыя. Нярэдка ў самы разгар халадоў падводзіць гаспадароў і ўласная печ: як правіла, надзвычайныя сітуацыі адбываюцца з-за няспраўнасці або парушэння правілаў мантажу печаў, цеплагенерацыйных агрэгатаў.

## Перапальванне печы, расколіна коміна і няспраўная электраправодка

Менавіта безуважлівасць да ўласнай печы, якую неабходна было падрыхтаваць да пачатку халадоў, прывяла да пажару ў Капыльскім раёне. Трагедыі ў ноч на панядзелак не дапусцілі неабыякавыя людзі, якія выратавалі гаспадара хаты. Заўважыў узгаранне аднавяскоўец, які вяртаўся дадому з фермерскай гаспадаркі. Падышоўшы да дома з яшчэ адным відавочцам, праз акно яны заўважылі ў жылым пакоі чалавека, які ляжаў на ложку. Разбіўшы акно, адзін з мужчын залез у дом, разбудзіў яго гаспадара, пасля чаго абодва тым жа шляхам пакінулі хату, ахопленую полымем. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Падраздзяленні МНС ліквідавалі ўзгаранне. У выніку пажару знішчаны дах, пашкоджаны сцены і маёмасць па ўсёй плошчы жылога дома. Папярэдняя прычына здарэння — парушэнне правілаў эксплуатацыі печаў, цеплагенерацыйных агрэгатаў і прылад (расколіна коміна).

З-за парушэння правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання (калі больш канкрэтна — з-за кароткага замыкання праводкі цеплавога абагравальніка) у Слаўгарадзе пасля ночы маглі не прачнуцца маці і яе трое дзяцей. Узгаранне адбылося ў інтэрнаце, дзе сям'я жыве. Як распавяла 23-гадовая жанчына, вечарам яна пакінула ўключаны абагравальнік у адным з пакояў і разам з дзецьмі пайшла спаць. Бліжэй да апоўначы гаспадыня прачнулася ад гуку аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, размешчаных у блоку, затым зайшла ў суседні пакой, дзе спала яе дзіця, і ўбачыла, што гарыць абагравальнік. Жанчына адключыла прыбор ад электрасеткі і заліла ўзгаранне вадой. Затым разбудзіла дзяцей і вывела іх у калідор інтэрната. Супрацоўнікі хуткай дапамогі, якія прыбылі на месца здарэння, агледзелі маці і дзяцей: яны не пацярпелі.

Пажар пашкодзіў маёмасць у блоку, былі закураны сцены і столь у пакоі. Эвакуацыя жыхароў інтэрната не праводзілася. Справа ў тым, што адначасова спрацавалі пажарныя апавяшчальнікі ў калідоры інтэрната, сістэма абвесткі аб пажары, а таксама сістэма перадачы паведамлення аб надзвычайнай сітуацыі «Маланка». Гэта дазволіла жыхарам і супрацоўнікам інтэрната своечасова адрэагаваць на здарэнне.

Дзякуючы аўтаномнаму пажарнаму апавяшчальніку заўчасна не пайшла з жыцця і жыхарка вёскі Дунічы Капыльскага раёна. Гаспадыня знаходзілася на кухні, як раптам пачула характэрны гук. У адным з пакояў яна ўбачыла агонь. Пенсіянерка выйшла на вуліцу і выклікала ратавальнікаў. Пажарныя аператыўна прыбылі на выклік і патушылі агонь, які паспеў поўнасцю знішчыць дах і пашкодзіць сцены. Прычына, якая прывяла да пажару, — парушэнне правіл эксплуатацыі печаў, цеплагенерацыйных агрэгатаў і прылад (расколіна коміна).

Адсутнасць нармаванай адступкі, якая была дапушчана пры мантажы печы, прывяла да пажару ў Любанскім раёне. Паведамленне аб узгаранні ў вёсцы Калінаўка паступіла ратавальнікам вечарам 9 студзеня. Падраздзяленні МНС, якія аператыўна выехалі на месца здарэння, выявілі задымленне ўнутры хаты. Пры правядзенні разведкі на ложку ў жылым пакоі выявілі гаспадара дома. Мужчыну вынеслі на вуліцу і перадалі медыкам. Пацярпелы быў дастаўлены ў раённую бальніцу.

Да ўзгарання прывяло і перапальванне печы ў жылым доме ў вёсцы Крупейкі Лоеўскага раёна. Парушэнне правілаў эксплуатацыі печы дапусціла гаспадыня. У момант узнікнення пажару 84-гадовая жанчына спала. Прачнулася ад гуку аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка і самастойна выйшла на вуліцу. Суседзі выклікалі ратавальнікаў, пажар быў ліквідаваны. Агонь знішчыў дах, пашкодзіў сцены і маёмасць. На шчасце, абышлося без пацярпелых.

— Аўтаномны пажарны апавяшчальнік адчувальны нават да нязначнага задымлення ў памяшканні, што спрыяе хуткаму выяўленню ўзгарання на ранняй стадыі, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Пры з'яўленні дыму ён падае моцны гукавы сігнал, які здольны апавясціць і пабудзіць чалавека, калі той спіць. Аўтаномны пажарны апавяшчальнік рэкамендуецца ўсталёўваць у кожным жылым пакоі, у цэнтральнай частцы столі з невялікім зрушэннем у бок акна або дзвярэй — там, дзе забяспечаны пастаянны паветраабмен.

## Падрыхтуйце печ і эксплуатуйце электрапрыборы правільна

Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях чарговы раз звяртаюць увагу на патрабаванні да эксплуатацыі пячнога ацяплення.

**Па-першае**, участак падлогі з гаручых матэрыялаў перад паліўнай адтулінай павінен быць абаронены негаручым матэрыялам шырынёй не меней чым 0,5 метра і даўжынёй не меней чым 0,7 метра. Размяшчэнне гаручых рэчываў і матэрыялаў на ім не дапускаецца (напрыклад, складванне дроў).

**Па-другое**, мінімальныя адлегласці ад паверхняў цеплагенерацыйных апаратаў да гаручых рэчываў і матэрыялаў павінны выключаць загаранне гаручых рэчываў і матэрыялаў.

**Па-трэцяе**, дымавыя трубы, зыходзячы з умоў эксплуатацыі, трэба перыядычна чысціць ад сажы (не радзей чым адзін раз на год!).

**Па-чацвёртае**, печы, паверхні труб і сцен, у якіх праходзяць дымавыя каналы, павінны быць спраўнымі, без скразных расколін. Для вызначэння расколін на ранняй стадыі комін неабходна абтынкаваць і пабяліць.

**Па-пятае**, штогод перад ацяпляльным сезонам неабходна праводзіць праверку спраўнасці печы, дымавых труб (каналаў).

**Па-шостае**, попел, вуглі і шлак, выдаленыя з цеплагенерацыйных апаратаў, печаў, павінны быць пралітыя вадой да іх поўнага згасання.

**Па-сёмае**, пры распальванні печы ні ў якім разе нельга выкарыстоўваць гаручыя і лёгкія на ўзгаранне вадкасці.

Не перагравайце печ, не паліце яе з адчыненымі дзверцамі, за выключэннем выпадкаў, калі канструкцыя печы прадугледжвае яе паленне з адчыненай камерай. І самае галоўнае — не пакідайце печ, якая паліцца, без нагляду. Выкананне правілаў пажарнай бяспекі зберажэ ваша жыццё і жыццё вашых блізкіх у перыяд ацяпляльнага сезона.

Каб пазбегнуць пажараў па прычыне няправільнай эксплуатацыі электраабсталявання, не выкарыстоўвайце няспраўныя выключальнікі, разеткі, агаленыя правады, а таксама самаробныя прыборы. З мэтай недапушчэння перагрузкі электрасеткі забараняецца адначасова ўключаць некалькі магутных спажыўцоў электраэнергіі. Сачыце за спраўнасцю электраправодкі і давярайце яе мантаж толькі прафесіяналам.

— Абавязкова адключайце электрапрыборы, сыходзячы з дому, — рэкамендуе Анастасія Швайбовіч. — Будзьце ўважлівыя пры эксплуатацыі электраабсталявання і своечасова арганізоўвайце яго рамонт. Звярніце ўвагу на зарадныя прылады планшэтаў, тэлефонаў і іншых гаджэтаў — ні ў якім разе не пакідайце іх у электрасетцы на ноч ці сыходзячы з дому: яны таксама нярэдка становяцца прычынай пажараў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы МНС.**

Тонкасці прафесіі

# ДЭСАНТ СЫХОДЗІЦЬ... ПАД ВАДУ

## Як вадалазы ў пагонах удасканальваюць сваё майстэрства

**Калі слупок тэрмометра паўзе ўніз, а роўнядзь вадаёмаў пакрываецца тоўстым пластом лёду, у ваенных вадалазаў надыходзіць гарачая пара. Кожную зіму на адным з вадаёмаў палігона «Лосвіда» 103-й Віцебскай асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады праводзіцца збор вадалазных падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл. Сёлета павысіць сваю кваліфікацыю сюды прыехалі найлепшыя вадалазныя спецыялісты часцей спецыяльнага прызначэння, паветрана-дэсантнай і дэсантна-штурмавой брыгад сіл спецыяльных аперацый, а таксама спецыяльнага атрада хуткага рэагавання ўнутраных войскаў МУС нашай краіны.**

## РЫЗЫКА І НЕБЯСПЕКА

Працэс спуску падобны на канвеер: пакуль адны — у вадзе, іншыя рыхтуюцца выконваць нарматывы. Перад тым як прыступіць да сваёй працы, вайскоўцы-вадалазы праходзяць сур'ёзную падрыхтоўку: як практычную, так і тэарэтычную.

Кожны ваенны вадалаз — унікальны і запатрабаваны спецыяліст. Дарэчы, праца вадалаза, роўна як і сапёра, не цярпіць мітусні. Інакш чакай бяды. Галоўная зброя падводнага плыўца — стрыманасць і разважлівасць. Як гавораць самі вадалазы, пад вадой іншы свет, іншая рэальнасць. Проста так у яго не трапіць. А ўжо калі трапіў, будзь заўсёды напагатове.

Як адзначае **вадалазны спецыяліст камандавання сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл падпалкоўнік Антон ЛЯПІЧ**, асабліваць збору ў тым, што ў ходзе практычных заняткаў ваеннаслужачыя вадалазных падраздзяленняў атрымліваюць навыкі выканання выбуховых работ пад лёдам. «Вадалаз — небяспечная прафесія, звязаная з рызыкай, таму важна пастаянна ўдасканальваць свае навыкі, абменьвацца вопытам, — кажа ён. — Падобныя зборы праводзяцца штогод. У іх бяруць удзел вопытныя спецыялісты, якія



ў сваіх воінскіх часцях штодзень выконваюць вадалазныя работы. Галоўная мэта — даказаць, што ты можаш і ўмееш, тым самым павысіць кваліфікацыю. Усе заняткі праходзяць ва ўмовах, максімальна набліжаных да баявых. Задачы даводзілася выконваць розныя. Самае складанае пасля апускання — працаваць ва ўмовах нулявой бачнасці. Практычна навобмацак пад лёдам вайскоўцы ўстанаўлівалі выбуховыя прылады».

Па выніках збору вайскоўцы, якія паспяхова здалі экзамены, атрымалі кваліфікацыю «вадалаз-узрыўнік». Акрамя таго, усе вадалазы абагаціліся неабходным досведам вадалазных работ у зімовых умовах пад лёдам.

## ЗНАЙСЦІ І ЗНІШЧЫЦЬ

Вадалаз для падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый — гэта сінтэз гросмайстра, інтэлектуала і фізічна моцнага чалавека з навыкамі стралка і майстра адзінаборстваў. Падводны спуск — няпростая задача нават для вопытных спецыялістаў. Вадалаз павінен быць падрыхтаваны і псіхалагічна, і фізічна. Спускацца пад ваду трэба асцярожна, не дапускаць удараў зарадаў аб крананне правадамі прадметаў. Пры кладцы і замацаванні зарадаў варта сачыць за тым, каб правады не зачапіліся за рыштунак.

Гэта пацвярджае **гвардыі малодшы сяржант кантрактнай службы Раман ЗАРУБА** з 38-й Брэсцкай асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады. «Акрамя выбуховых работ пад лёдам ёсць заняткі па хаджэнні па азімуце пад вадой, выхад у пэўны раён і выкананне там розных задач, — тлумачыць малады чалавек. — На такіх зборах работа ідзе не толькі пад вадой, але і на паверхні. Таксама павышаем зладжанасць разлікаў, дасканала трэніруем страхавальных вадалазаў. Пры гэтым работа ў зімовых умовах для нас не праблема: пачынаючы са снежня і да красавіка вадалазы вучацца дзейнічаць пад лёдам».

Ваеннаслужачыя прызнаюцца, што зборы вельмі карысныя тым, што даюць магчымасць сустрэцца з калегамі, абмяняцца досведам. Важна, што ў зборах бяруць удзел і прадстаўнікі іншых сілавых ведамстваў.



...І вось зарад апускаецца на дно разам з вадалазам-мінёрам. На жаль, журналістам не бачныя маніпуляцыі баявога плыўца пад вадой. Таму пра ўсе нюансы падводнай работы расказвае **гвардыі прапаршчык Максім ЮДЧЫЦ**, яшчэ адзін прадстаўнік дэсантна-штурмавога злучэння з Брэста. «Пад лёдам нічога не відаць, таму да месца выканання задачы выходзіш па азімуце, пасля чаго атрымліваеш сігнал да выканання задачы, — распавядае ён. — Далей усталёўваеш зарад, выходзіш наверх і робіш падрыў. Алгарытм нескладаны».

Беларускія вадаёмы дагэтуль захоўваюць небяспечнае рэха вайны. У гэтым злучэнні вадалазы займаюцца падводным размініраваннем, рэагуюць на тэрміновыя заяўкі аб знаходжанні выбуханебяспечных прадметаў пад вадой, якія паступаюць у тым ліку ад насельніцтва ці падводных паляўнічых. Задача гэтых рэдкіх і сапраўды высакакласных спецыялістаў — выехаць на месца, знайсці і абследаваць названы прадмет, а таксама знішчыць яго.

**Алег НЯКАЛА,**
**фота аўтара.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего сельскохозяйственному производственному кооперативу**

# «Нива-2003»

**Аукцион состоится 21.02.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | Лот 1:<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-74813 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – школа), площадь 532,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Подлабенский с/с, д. Конюхи, 34А;<br>- капитальное строение, инв. № 400/С-74816 (назначение – здание специализированное для образования и (или) воспитания), площадь 326,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Подлабенский с/с, д. Конюхи, 34А/1;<br>- многолетние насаждения, в том числе аллея кустов 90 м, березы (4 шт.), вишня (3 шт.), саженцы яблонь, слива (25 шт.), яблоня (27 шт.).<br>Лот 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422080407401000089 (назначение – земельный участок для размещения объектов образования и (или) воспитания) площадью 1,5791 га по адресу: Гродненский р-н, Подлабенский с/с, д. Конюхи, 34А.<br>Обременения со стороны третьих лиц отсутствуют.<br>Условия аукциона – возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи |
| **Начальная цена продажи** | 16 032 руб. (шестнадцать тысяч тридцать два рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 603 руб. (одна тысяча шестьсот три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 19.02.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.11.2023 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА»

**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Будкова К.В., извещает о проведении 6 февраля 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9**

ПОЛНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 21 лота (№№ лотов 2-4, 5-7, 10-14, 17, 18, 20-23, 25-28, 31).
**размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 31.08.2023 г. № 168 (30048)**

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **24 января 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 2 февраля 2024 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, УНП 400395996 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов**<br>Адрес: **Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. Ленинская, 6-1** | |
| **Административное помещение № 1 – 746,8 кв. м**<br>(инв. номер 331/D-1317, составные части и принадлежности: электроснабжение, теплосеть, водопровод, канализация).<br>***Обременение*:** площади помещения сданы в аренду.<br>Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона | |
| **Начальная цена лота без НДС – 443 107,25 бел. руб.** | |
| Шаг электронных торгов составляет 5 % от начальной цены предмета электронных торгов | |
| **Порядок осмотра:** по предварительному согласованию в рабочие дни с 8.30 до 17.15 – Симанович Зинаида Юльевна, +375 29 607-08-25 | |
| Задаток **88 178,00 бел. руб.** перечисляется на р/с BY47BELB 3012002850003022600 0 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. По письменному заявлению покупателя может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3 лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by, с соблюдением требований, установленных Положением «О порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики от 12.07.2013 № 608 «О проведении электронных торгов» (в ред. постановления Совмина от 01.12.2023 № 846). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи предмета электронных торгов, указанной в протоколе о результатах электронных торгов, либо в протоколе о признании электронных торгов несостоявшимися, в случае согласия претендента на покупку на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения торгов | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.02.2024 с 11.00 до 12.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.<br>**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.02.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)** | |

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего

# ОАО «Агросервис»

**(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)**

Аукцион состоится **27.02.2024 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис Организатора аукциона)

**Лот № 1:**

**капитальное строение с инв. № 700/С-50205 – здание склада запчастей и цемента,** пл. 96,9 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а;

**6/100 долей капитального строения с инв. № 700/С-117992 – промышленная площадка для стоянки автомобилей** (пл. всего кап. строения 17110,5 кв. м, назначение: сооружение специализированное транспорта, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5;

**15/100 долей капитального строения с инв. № 700/С-118291 – кирпичное ограждение, в том числе 1-и ворота,** назначение: сооружение благоустройства, протяженностью всего кап. строения 175,3 м, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/8.

Составные части и принадлежности: сооружение кирпичное ограждение, в том числе 1-и ворота, состоящие из пяти ограждений, ворот.

**Сведения о земельном участке:** кадастровый № 740100000007006131 (право постоянного пользования, пл. 3,3041 га; целевое назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений для обслуживания автотранспорта; ограничения (обременения) прав: постоянный и бессрочный сервитут для прохода, проезда к доминантному объекту (пл. 0,0410 га). В настоящее время проводится изменение вида вещного права в отношении земельного участка с права постоянного пользования на право аренды сроком на 50 лет. Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа 40901.

Срок подачи документов: до 12.00 26.02.2024. Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона gostorg.by.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже пустующего жилого дома в частную собственность в д. Гриневичи, д. 5 Крайского сельсовета Логойского района Минской области

| | |
|---|---|
| **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| **Наименование предмета аукциона** | Жилой дом |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **27 февраля 2024 года в 15.00, аг. Крайск, ул. Буденного, д. 8, Крайский сельисполком, зал заседаний** |
| **Продавец и его адрес, телефоны** | Крайский сельский исполнительный комитет, 223138, Минская область, Логойский район, аг. Крайск, ул. Буденного, д. 8 тел.: 1774-73-6 35;1774-73-6-36; A1 44 5990948 |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, Логойский район, д. Гриневичи, д. 5 |
| **Общая площадь жилых помещений** | 48,0 кв. м |
| **Описание имущества** | Одноэтажный, одноквартирный жилой дом, материал стен – бревно, деревянные перекрытия, крыша – шифер, отопление печное. Водопровод, канализация отсутствуют. Не зарегистрирован |
| **Условия аукциона по продаже пустующих домовладений** | Возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в соответствии с актом выполненных работ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона |
| **Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.** | 40,00 |
| **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, **8,00 руб.;** получатель: Крайский сельисполком, BY56AKBB36006190811060000000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 04707 |
| **Адрес земельного участка** | Минская область, Логойского район, д. Гриневичи, д. 5 |
| **Площадь земельного участка** | Не зарегистрирован |
| **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| **Дата начала приема документов** | С даты объявления аукциона |
| **Окончательный срок приема документов** | **21 февраля 2024 года до 17.00** |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by | |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛАЗ-СЕРВИС», 222160, Минская обл., г. Жодино, ул. Брестская, 31, тел. +375 177558884 | |
| **Предмет электронных торгов: спецтехника, расположенная по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Брестская, 31** | | |
| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
| 1 | **Шарнирно-сочлененный самосвал Белаз-75281, идентификационный номер Y3B75281VD0000015, 2013 г. в.** | **558 867,00** |
| 2 | **Шарнирно-сочлененный самосвал Белаз-75281, идентификационный номер Y3B75281CD0000014, 2013 г. в.** | **558 867,00** |
| 3 | **Шарнирно-сочлененный самосвал Белаз-75281, идентификационный номер Y3B75281JD0000013, 2013 г. в.** | **558 867,00** |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by | | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | | |
| Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 09.12.2023 г. | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.02.2024 г. с 11.00 до 13.00**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.02.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | | |
| **Контактные данные** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** | |

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 студзеня 2024 г. № 3 (736)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «МЕНАВІТА Ў ГЭТЫ ЧАС КОЖНАМУ ТРЭБА РАЗУМЕЦЬ, ШТО КРАІНА — ГЭТА ЎСЕ МЫ»

**СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з працоўным калектывам Мінскага трактарнага завода. Візіт пачаўся з размовы з кіраўніцтвам прадпрыемства. Генеральны дырэктар МТЗ Віталь ВОЎК паведаміў Наталлі Качанавай аб цяперашнім стане спраў, акрэсліў далейшыя перспектывы вытворчасці. Пасля даклада — сустрэча з работнікамі завода, тымі, хто сваёй працай ствярае не проста якасную сельскагаспадарчую тэхніку, а сапраўдны брэнд нашай краіны.**









## «Мы разумеем, што сёння важна сустракацца з працоўнымі калектывамі»

Напачатку размовы Наталля Качанава зазначыла, што сустрэчы з працоўнымі калектывамі — гэта не толькі добрая традыцыя, але яшчэ і дзейная зваротная сувязь. Члены Савета Рэспублікі вельмі ўважліва ставяцца да такой формы работы, імкнуцца ўнікнуць ва ўсе праблемы грамадзян, што звяртаюцца да іх. А тых зваротаў нямала: за мінулы год сенатары правялі больш за 2000 сустрэч у калектывах, разгледзелі 7,5 тысячы зваротаў рознага кшталту, правялі 360 прамых тэлефонных ліній і 700 прыёмаў па асабістых пытаннях. Аб чым гаворыць такая шырокамаштабная работа? Толькі аб тым, што ўлада з увагай ставіцца да праблем чалавека, кожны зварот, кожная прапанова разглядаюцца з улікам канкрэтных, уласцівых толькі гэтай сітуацыі абставін. Дарэчы, і амаль першыя словы Наталлі Качанавай на сустрэчы датычыліся менавіта зваротнай сувязі:

— Я буду шчыра ўдзячная вам, калі вы на самай справе абазначыце пытанні, якія хвалююць вас. Магчыма, прапановы, пажаданні. Для нас гэта вельмі важна... Зыходзячы з таго, што мы бачым і чуем, нам прасцей працаваць, разумець, якія пытанні хвалююць сёння людзей, — зазначыла Старшыня верхняй палаты парламента. І дадала, што прадстаўнікі ўлады даносяць да працоўных актуальную інфармацыю, якая таксама дапамагае зняць пэўныя пытанні. А магчымасць задаць хвалюючыя пытанні прама на сустрэчы і, як нярэдка здараецца, тут жа атрымаць дакладны адказ з першых вуснаў здымае неабходнасць запісвацца на асабісты прыём і залішне хвалявацца наконт яго — на родным прадпрыемстве і сцены дапамагаюць.

## «Свет мяняецца, і за нашым Прэзідэнтам — мір і спакой у краіне»

Асобна Наталля Качанава спынілася на знешнепалітычных падзеях вакол Беларусі і не толькі. Яна адзначыла, што сітуацыя, у якой апынулася не адна наша краіна, але і ўвесь свет — вельмі няпростая. І гэта выклікае занепакоенасць, бо назіраецца сур'ёзная небяспека з боку тых працэсаў, якія адбываюцца. У сувязі з імі нават канфлікт ва Украіне адышоў на другі план, больш хвалюе Блізкі Усход. Усё больш краін аказваюцца ўцягнутымі ў канфлікт, і ўсё часцей і больш гавораць аб ядзернай вайне. А тыя міждзяржаўныя пагадненні, што былі заключаны раней, сёння ўжо практычна не выконваюцца, шраг краін напросту выйшлі з іх.

— Але я ўпэўнена, што розум чалавечы павінен перамагчы, таму што няма нічога важнейшага на зямлі, чым мір і спакой. У гэтым годзе мы будзем адзначаць 80 гадоў з дня вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І мы, беларусы, вельмі добра разумеем, што такое мір і што такое цана чалавечага жыцця, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

І ў працяг тэмы 80-годдзя вызвалення нагадала прысутным пра ініцыяваную пракуратурай работу па вывучэнні генацыду беларускага народа. Сапраўды, колькі гадоў прайшло, а мы толькі сёння даведваемся пра новыя, раней невядомыя факты знішчэння нашага народа, нашай краіны.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Сустрэчы з калектывамі і дабрачыннасць

### Падрабязнасці працоўнага тыдня сенатараў

• У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірыны СТАРАВОЙТАВАЙ** з прадстаўнікамі Магілёўскай гарадской арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Парламентарый расказала аб заканадаўчай і міжпарламенцкай дзейнасці Савета Рэспублікі, яго пастаянных камісій, прыярытэтных кірунках работы, аб асаблівасцях электаральнай кампаніі 2024 года, задачах, якія стаяць перад грамадствам у Год якасці. Ірына Старавойтава таксама закранула праблемы ўдасканалення нацыянальнай сістэмы адукацыі. У прыватнасці, яна адзначыла, што галоўная задача — напоўніць прававыя нормы, якія датычацца выхаваўчай ролі настаўніка, рэальным глыбокім зместам і правільна выбудаваць цэласную сістэму выхавання, якая ахоплівае ўсе ўзроўні навучання, забяспечвае пераемнасць пакаленняў, зберажэнне каштоўнасцяў і традыцый, дапамагае кожнаму дзіцяці стаць сапраўдным грамадзянінам і патрыётам сваёй краіны. Сенатар адказала на пытанні прысутных і заклікала ўсіх актыўна ўдзельнічаць у палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным развіцці дзяржавы, умацоўваць аўтарытэт краіны.

• **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** у рамках адзінага дня інфармавання сустрэўся з працоўным калектывам 4-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы. Парламентарый акцэнтаваў увагу супрацоўнікаў на тым, што якасць жыцця насельніцтва нашай краіны залежыць ад якасці працы медыцынскіх работнікаў. Сяргей Рачкоў праінфармаваў, што ў Савет Рэспублікі ў 2023 годзе паступіла каля 500 зваротаў грамадзян, якія датычацца сферы аховы здароўя і неабходнасці яе ўдасканалення. Сенатар расказаў аб асноўных выніках дзейнасці Савета Рэспублікі ў 2023 годзе ў кантэксце сучаснага геапалітычнага становішча.

• **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня РГА «Белая Русь», старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ** прыняў удзел у акцыі «Белая Русь» — дзецям Данбаса». Ініцыятыва рэспубліканскай грамадскай арганізацыі, якая стартавала ў пачатку снежня, аказалася па-сапраўднаму ўсенароднай і аб'яднала ўсе вобласці і раёны нашай краіны. «Цяпер на складах знаходзіцца больш за 12 тон гуманітарнай дапамогі, якая была сабрана актывам пярвічных арганізацый РГА «Белая Русь» горада Мінска і некаторых раёнаў Мінскай вобласці, — расказаў Алег Раманаў. — У найбліжэйшы час будзе дастаўлена гуманітарная дапамога з Гомельскай вобласці і далей з усіх астатніх абласцей. Цяпер вядзецца работа па сартаванні гуманітарнай дапамогі». У якасці валанцёраў грамадскай арганізацыі дапамагаюць курсанты Ваеннай акадэміі і студэнты Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. На наступным тыдні прадукты харчавання, салодкія падарункі, канцылярскія прылады, лекі, медыцынскія вырабы, сродкі гігіены і шмат іншага адправіцца ў Данбас.

• **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ** у рамках адзінага дня інфармавання правёў сустрэчу з кіраўнікамі хакейных клубаў краіны. На сустрэчы абмяркоўвалася падрыхтоўка да кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Акрамя таго, асаблівую ўвагу сенатар удзяліў сацыяльнаму складніку ў рабоце кіраўнікоў.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ, КАМФОРТНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЖЫХАРОЎ

## Што хвалюе старшынь сельскіх Саветаў?

**СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Наталля Качанава на мінулым тыдні запрасіла ў верхнюю палату парламента старшынь абласных і сельскіх Саветаў дэпутатаў. Спікер падкрэсліла, што пры падрыхтоўцы законаў надзвычай важна ведаць, як жывуць людзі на месцах. Адбылася шчырая размова аб надзённых пытаннях, з якімі штодзень сутыкаюцца прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання. Ад іх прагучалі як пытанні, так і прапановы, у тым ліку па ўдасканаленні дзейнага заканадаўства.**



Фота БелТА.

### Даўгабуды і безгаспадарныя дамы

**Старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Дзмітрый КУДЗІН** расказаў аб сітуацыі на тэрыторыі сельсавета. Яго асаблівасць — геаграфічнае становішча. Гэта прысталічча са знакавым сімвалам мужнасці і гістарычнай памяці — Курганам Славы.

У сельсавеце 28 населеных пунктаў, дзе звыш 7 тысяч зарэгістраваных жыхароў, з якімі падтрымліваецца пастаянны кантакт праз сельскі актыў і старастаў. Дзякуючы ім, ёсць аператыўная зваротная сувязь і вырашаюцца пытанні, якія ўзнікаюць у грамадзян. Базавае прадпрыемства — «Азярыцкі-Агра». Адміністрацыйны цэнтр — аграгарадок Слабада з больш чым 3,5 тысячы насельніцтва. На тэрыторыі сельсавета жыве 110 шматдзетных сем'яў. Гэта аўкцыённая зона. За 2023 год рэалізавана 22 участкі. Будуецца жыллё, перыяздджаюць людзі.

Пытанні ў насельніцтва перыядычна ўзнікаюць. На мясцовым узроўні іх імкнуцца здымаць. У вырашэнні складаных пытанняў дапамагае абласны Савет дэпутатаў.

— Абласныя, раённыя, гарадскія Саветы дэпутатаў павінны быць пастаянна з вамі ў кантакце. Мы нацэльваем іх на гэта. Але рашэнні трэба прымаць аператыўна. Ніхто ніколі не адмовіць у дапамозе і спрыянні, — пракаментавала Наталля Качанава.

**Жанна БІЗНЯ, старшыня Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна,** у склад якога ўваходзіць 14 населеных пунктаў з больш як 11 тысячамі жыхароў і 56 садаводчымі таварыствамі, закранула пытанне па рэалізацыі Указа № 87, які датычыцца даўгабудаў.

— Ва ўказе прапісана, што перад тым, як мы падаем іск у суд, мы павінны зрабіць ацэнку. Агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры робіць ацэнку толькі ў прысутнасці ўласніка і пры наяўнасці праектнай дакументацыі. На жаль, гэта не заўсёды магчыма. Некаторыя ўласнікі гэтых даўгабудаў жывуць за межамі Беларусі, і праектная дакументацыя ёсць не заўсёды. У выніку мы не можам рухацца далей па адабранні гэтых даўгабудаў. Нават калі мы атрымалі станоўчыя рашэнні суда, выходзім на продаж з публічных таргоў, пачатковая цана продажу лота павялічваецца на кошт гэтай ацэнкі. І цана становіцца не прывабнай для пакупнікоў. І мы сутыкнуліся з тым, што канфіскаваныя недабудаваныя аб'екты не запатрабаваны. У сувязі з гэтым нашы прапановы: можа быць, разгледзець пытанне рэалізацыі Указа № 87 па аналогіі з Указам № 116. Або прамы продаж зямлі праз аўкцыён з абцяжараннем на гэтым участку — аб'ектам незавершанага будаўніцтва.

Наталля Качанава паабяцала яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытання і вывучыць сітуацыю самым сур'ёзным чынам.

**Старшыня Вердаміцкага сельскага Савета дэпутатаў Свіслацкага раёна Алена САЛАВЕЙ** унесла прапанову па фактычна безгаспадарных дамах. Яна расказала, што правапераемнікі могуць апратэставаць іск у судзе аб прызнанні іх дома безгаспадарным або яшчэ да падачы дакументаў у суд звярнуцца ў мясцовы выканаўчы орган з апавяшчэннем аб далейшым намеры выкарыстоўваць жылы дом для пражывання. Але, як паказвае практыка, каля 80 працэнтаў гэтых людзей сваё абяцанне не стрымліваюць. Яна прапанавала замацаваць адказнасць правапераемнікаў гэтых дамоў нарматыўнымі прававымі дакументамі: калі яны на працягу адведзенага ім гадавога тэрміну не прывялі зямельны ўчастак у належны выгляд і не прынялі меры па прывядзенні жылога дома таксама ў належны выгляд, праз год камісія паўторна можа выехаць, паглядзець на гэты дом і прыняць меры па вызначэнні яго далейшага лёсу.

Наталля Качанава паабяцала разгледзець гэту прапанову.

### Добраўпарадкаванне тэрыторый

**Старшыня Крамяніцкага сельскага Савета дэпутатаў Зэльвенскага раёна Аляксандр ДЗЯРЭНЧЫК** звярнуў увагу на ўтрыманне і абслугоўванне ўчасткаў дарог і вуліц, якія не маюць уласнікаў.

— У раёне дадзеная работа па перадачы спецыялізаваным арганізацыям праводзіцца, але перыяд падрыхтоўкі дакументаў і перадача зацягваюцца. У сувязі з гэтым пытанне: ці магчыма на заканадаўчым узроўні сельвыканкамам перадаць астатнія безгаспадарныя ўчасткі дарог або вуліц спецыялізаваным арганізацыям без прадастаўлення праваўстанаўліваючых дакументаў? Або, як варыянт, прадугледзець закладванне ў бюджэце сельвыканкама сродкаў на абслугоўванне і ўтрыманне гэтых безгаспадарных участкаў дарог.

Наталля Качанава пагадзілася, што трэба паглядзець і абмеркаваць гэтыя пытанні.

**Мікалай ЛУГАЎСКОЙ, старшыня Ленінскага сельскага Савета** дэпутатаў Жабінкаўскага раёна, дзе ў 11 населеных пунктах пражывае 2,5 тысячы насельніцтва і на тэрыторыі якога знаходзяцца ААТ «Рагазнянскі» і санаторыі «Буг» і «Надзея», звярнуўся з пытаннем навядзення парадку на тэрыторыях.

— Фішкай першага рэгіёна з'яўлялася і з'яўляецца чысціня, акуратнасць і аператыўнае прывядзенне ў парадак тэрыторый, у тым ліку прылеглых да трасы М-1. Сёння ў нас з гэтым вялікія праблемы. Звязана гэта з правядзеннем тэндэраў на навядзенне парадку ў населеных пунктах і падведамных тэрыторыях. Каб правесці аператыўны пакос, пафарбаваць лаўкі, правесці суботнік, арганізаваць вываз адходаў, трэба правесці тэндар. Гэта займае ад тыдня да месяца, у сувязі з чым аператыўнасць падае. Вынік — незадаволенасць вышэйстаячых арганізацый, насельніцтва. Прапанова прадугледзець у законе аб закупках для мясцовых органаў улады, у тым ліку сельскіх выканкамаў, магчымасць правядзення адзінай закупкі на гэтыя мэты — навядзенне парадку, добраўпарадкаванне тэрыторыі. Гэта дазволіць знізіць сацыяльную напружанасць, вярнуць аператыўнасць.

Яшчэ адна прапанова — павялічыць грашовае забеспячэнне старастаў, якія з'яўляюцца першым памочнікам на сяле. На гэтых людзей заўсёды можна спадзявацца, да іх у вёсцы ў першую чаргу звяртаюцца людзі. Сёння большая частка старастаў — пенсіянеры. Яны атрымліваюць узнагароду раз на тры месяцы, выходзячы з колькасці населеных пунктаў, і сума не перавышае тры базавыя велічыні. Яе хапае толькі на тэлефонныя размовы.

Наталля Качанава паабяцала паспрабаваць дапамагчы ў гэтых пытаннях.

**Пытанне старшыні Александрыйскага сельскага Савета дэпутатаў Шклоўскага раёна Алены ГВОЗДЗЕВАЙ** таксама датычылася добраўпарадкавання тэрыторый.

— У адпаведнасці з артыкулам 41 Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў рамках сваёй кампетэнцыі сельскія Саветы арганізуюць працу па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Але артыкулам 46 Бюджэтнага кодэкса бюджэтам першаснага базавага ўзроўню фінансаванне прадугледжана на добраўпарадкаванне адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. У сувязі з тым, што ў нас няма работнікаў па абслугоўванні гэтых тэрыторый, гэтыя работы ў нас праводзяцца па грамадзянска-прававых дагаворах. Ці магчыма сельскім Саветам рабіць закуп садовага інвентара і абсталявання, у прыватнасці трымераў, бензапіл, кос, якім можна здзяйсняць высечку драўняна-хмызняковай і пустазельнай расліннасці? Цяпер закупіць гэтае абсталяванне мы не маем права.



Старшыня Жыровіцкага сельскага Савета дэпутатаў Слонімскага раёна Дзмітрый Нагула дадаў, што Міністэрства эканомікі накіроўвала тлумачэнні аб тым, што сельсавет не мае права закупляць такое абсталяванне і весці гаспадарчую дзейнасць.

Наталля Качанава паабяцала разабрацца ў праблеме.

**Старшыня Апольскага сельскага Савета дэпутатаў Іванаўскага раёна Галіна ВАРАШЫЛАВА** закранула пытанні электрыфікацыі.

— Сёння закрываюцца пытанні ўводу ў эксплуатацыю станцый абезжалезвання, праводзіцца газіфікацыя сельскіх населеных пунктаў, развіваецца сельская і асабістая падсобныя гаспадаркі. Разам з тым многія сельскія населеныя пункты, у прыватнасці Апольскага сельсавета, не патрапілі ў перспектыўны план газіфікацыі. І для нас цяпер актуальная электрыфікацыя жылых дамоў для патрэб ацяплення і водападагрэву. Мы разумеем, што ў больш старых вёсках лініі электраперадачы састарэлыя. Таму хацелася б, каб звярнулі ўвагу менавіта на тыя населеныя пункты, якія абышла газіфікацыя, — акрэсліў праблему старшыня сельсавета.

— Мы даручым міністру энергетыкі разабрацца і праінфармаваць, у якім годзе будуць прынятыя меры па рэканструкцыі ліній электразабеспячэння або правядзенні новых. Разбяромся, — пракаментавала Наталля Качанава.

**Старшыня Каменскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна Віцебскай вобласці Мікалай СІНІЦЫН** расказаў пра асаблівасці дзейнасці сельсавета:

— Мы знаходзімся ў глыбінцы — 170 км ад Мінска, 110 — ад Віцебска. За час дзеяння Указа Прэзідэнта па продажы зямельных участкаў прададзена 85 участкаў, знесена 162 старыя дамы. У мінулым годзе ўвялі ў эксплуатацыю 1260 квадратных метраў жылой плошчы — каля 13 дамоў. З 2001 года пры сельвыканкаме дзейнічае механізаваная брыгада, а з 2005 года — камунальнае ўнітарнае прадпрыемства. Працуе сем чалавек. Працуе прыбыткова, і я лічу, што адмаўляцца ад гэтага не трэба. Маем у наяўнасці ўсю тэхніку для апрацоўкі зямельных участкаў, якую ўзялі ў лізінг і выплацілі ўсе сродкі. Можам своечасова аказваць дапамогу грамадзяніну, які звярнуўся па прымальных расцэнках. У зімовы час КУП дапамагае расчышчаць вуліцы ад снегу. Каля 12 населеных пунктаў мы расчышчаем сіламі прадпрыемства. Акрамя таго, мы закупляем малако ў двух населеных пунктах.

Пытанне датычылася дазволу высякаць алешыну на сельскагаспадарчых палях і выкарыстоўваць яе для пячнога ацяплення. У Віцебскай вобласці дробнаконтурныя палі, якія час ад часу зарастаюць драўняна-хмызняковай расліннасцю: алешынай, лазой. Раней гэта расліннасць высякалася для падпалкі печаў, сёння насельніцтва часцей карыстаецца электрычнасцю, многія перайшлі на газавае ацяпленне. Алешыну высякаць забаронена.

— Да нас ужо звярталіся людзі па такім пытанні. Мы вырашалі яго сумесна з Міністэрствам прыроды і Міністэрствам лясной гаспадаркі. Абмяркуем яшчэ раз, — пагадзілася Наталля Качанава.

## Што замест міні-палігонаў?

**Старшыня Малюшыцкага сельскага Савета дэпутатаў Карэліцкага раёна Віктар ДЗІРВУК** расказаў, што ў раёне дзейнічала 55 міні-палігонаў і пляцовак часовага складзіравання цвёрдых бытавых адходаў. У сельсавеце іх было 8 — 2 міні-палігоны і 6 пляцовак. За іх утрыманне несла адказнасць РУП «ЖКГ». Іх ліквідавалі, землі закультывавалі. Работнікамі сельвыканкама і РУП «ЖКГ» была ўзмоцнена работа па заключэнні дагавораў з жыхарамі на вываз цвёрдых бытавых адходаў. Была праведзена добрая работа. Разам з тым у дагаворах не ўсе віды адходаў былі ўлічаны. Напрыклад, будаўнічыя адходы, адходы раслліннага свету не вывозіліся.

Сельвыканкам вядзе тлумачальную работу, што самі жыхары могуць адвезці гэтыя адходы сваім транспартам на адзіны палігон і там разгрузіцца за пэўную плату. РУП «ЖКГ» можа аказаць паслугу жыхарам па зборы і вывазе гэтых адходаў. Але для насельніцтва гэтая паслуга атрымліваецца «залатой». І, натуральна, людзі знаходзяць іншыя варыянты, уладкоўваюцца несанкцыянаваныя звалкі. Прагучала прапанова разгледзець магчымасць выдзеліць участак на тэрыторыі сельсавета для назапашвання і цэнтралізаванага вывазу такіх адходаў.

— Мы павінны разумець, што перш чым нешта ліквідаваць, трэба прапанаваць людзям альтэрнатыву. Лічу, што да гэтай тэмы трэба вяртацца. Мы прыбралі міні-палігоны, але мы не вырашылі праблему. Дадзім даручэнні міністру ЖКГ, міністру прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, — адрэагавала Наталля Качанава.

**Старшыня Славенскага сельскага Савета дэпутатаў Шклоўскага раёна Уладзімір МІШЫН** звярнуўся з пытаннем незапатрабаваных зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў межах населеных пунктаў. Не заўсёды ўяўляецца магчымым іх перадаць сельскагаспадарчым арганізацыям з прычыны таго, што яны дробнаконтурныя, малой плошчы. Часта яны мяжуюць з землямі, якія перададзены сялянскім фермерскім гаспадаркам. Ці магчыма ўнесці змены ў артыкул 52 Кодэкса аб зямлі ў частцы дазволу раённым і выканаўчым камітэтам выдзяляць гэтыя землі для вядзення фермерскай гаспадаркі, спытаў старшыня сельсавета

**Старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ,** які прысутнічаў на сустрэчы, парэкамендаваў прыняць рашэнне на сесіі аб пераводзе зямель агульнага карыстання ў землі сельгаспрызначэння і аддаваць фермерам. У Віцебскай вобласці так і было зроблена.

— Трэба яшчэ раз паглядзець, бо мясцовым органам улады такія паўнамоцтвы дадзены. Там, дзе пытанні датычацца зямель сельгаспрызначэння і ляссоў першай катэгорыі, гэта засталося непарушаным. А ўсё астатняе аддалі на рашэнне мясцовых органаў улады. Але мы падкажам, як вырашыць пытанне, — адзначыла Наталля Качанава.

Напрыканцы сустрэчы яна паабяцала, што ўсе пытанні, якія прагучалі, будуць акумуляваны і абмеркаваны з зацікаўленымі. А сустрэчы з мясцовымі дэпутатамі будуць праводзіцца і надалей.

**Алена КРАВЕЦ.**

# «МЕНАВІТА Ў ГЭТЫ ЧАС КОЖНАМУ ТРЭБА РАЗУМЕЦЬ, ШТО КРАІНА — ГЭТА ЎСЕ МЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Дык няўжо нас можна абвінавачваць у тым, што Беларусь сёння не стаіць на прынцыпах міру?! — задала рытарычнае пытанне Наталля Качанава. Так, гэтыя абвінавачванні выглядаюць, мякка кажучы, неабгрунтаванымі. Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова звярнуцца да Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, да Ваеннай дактрыны. Абодва дакументы ясна і дакладна гавораць: Беларусь — гэта міралюбівая дзяржава.

— Мы ніколі нікому не пагражалі і пагражаць не збіраемся. Але бараніць сваю краіну мы будзем. Мы проста абавязаны гэта рабіць… Бо мы разумеем, што фашызм і нацызм паднімаюць галовы. І паглядзіце, з якой сілай. Сёння, як ніколі, міралюбівая палітыка любой дзяржавы вельмі важная, — падкрэсліла спікер.

Наталля Качанава паведаміла, што Прэзідэнтам Беларусі, парламентарыямі краіны, праводзіцца вялікая работа па прасоўванні міралюбівых і міратворчых ініцыятыў, па спыненні гарачых канфліктаў, якія ні да чаго добрага, вядома, не прывядуць. Таксама яна зазначыла, што адна з прычын нагнятання міжнароднай напружанасці — у жаданні кіраўніцтва некаторых краін апраўдаць і схаваць ад насельніцтва ўласныя недахопы ў кіраванні, ва ўнутранай палітыцы. Ці няма ў іх праблем? Мноства. Аднак яны спрабуюць навязаць усяму свету думку, што ім пагражаюць Расія, Беларусь… Але ж, як зазначыла прамоўца, мы ніколі і нікому не пагражалі і пагражаць не будзем і нікога не лічым сваім ворагам. Аднак мы сёння павінны зрабіць усё, каб у выпадку неабходнасці сваю краіну абараніць. А для гэтага патрэбна моцная эканоміка.

## «Вельмі важна цаніць сацыяльныя гарантыі»

Наталля Качанава адзначыла, што эканамічныя вынікі 2023 года станоўчыя: унутраны валавы прадукт склаў 103,9 %, назіраецца рост па экспарце, фарміруецца бюджэт. Усё гэта дазваляе выконваць усе сацыяльныя гарантыі дзяржавы — гэта і штогадовае, і неадназаразовае павышэнне пенсій, дапамог, павелічэнне мацярынскага капіталу і дастойная заработная плата чалавеку працы. Увогуле сацыяльна накіраваныя артыкулы бюджэту складаюць значную яго частку. І гэта трэба цаніць.

Старшыня Савета Рэспублікі засяродзіла таксама ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на тым, што эканоміка для нас — гэта архіважна. Яе развіццё цалкам залежыць ад тых, хто працуе на прадпрыемствах і ў арганізацыях, ад колькасці работнікаў і іх адказнасці. Менавіта моцная эканоміка дазваляе нам жыць камфортна і якасна.

Гэты год — Год якасці, і сёння ўжо зацверджаны Дзяржаўны знак якасці, распрацаваны план мерапрыемстваў на бягучы год. Але Год якасці — гэта не толькі выпуск тавараў народнага спажывання ці якой-небудзь прадукцыі, якая будзе мець гэты знак. Гэта якасць ва ўсім: і ў працы, і ў жыцці, і ў чалавечых і сямейных стасунках. А галоўнае, па словах Наталлі Качанавай, сёння нельга быць абыякавымі. Трэба глядзець і заўважаць недахопы, дапамагаць іх устараняць.

— Як сказаў наш Прэзідэнт на нарадзе аб асноўных напрамках работы па ўдасканаленні якасці ў 2024 годзе і Знаку якасці Рэспублікі Беларусь: калі не ведаеце, што рабіць у Год якасці, пачніце з сябе: прыходзьце своечасова на работу, вырашайце тыя задачы, якія стаяць перад вамі па службе, прычым вырашайце эфектыўна, не сыходзячы ў бок і не віляючы, — працытавала яна Прэзідэнта. І дадала: — Ад кожнага з нас сёння залежыць будучыня краіны.



## «Краіна — гэта ўсе мы»

І вырашыць будучыню краіны ўсім нам давядзецца вельмі хутка. Гэты год — год выбараў: мы ўпершыню ў адзіны дзень галасавання будзем выбіраць дэпутатаў усіх узроўняў — 12 514 дэпутатаў мясцовых Саветаў і 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Таксама напярэдзе фарміраванне Усебеларускага народнага сходу, найвышэйшага органа народаўладдзя, які будзе прымаць стратэгічна важныя рашэнні для жыцця нашай краіны. Наступны год таксама будзе не менш вырашальным — адбудуцца прэзідэнцкія выбары.

> Мы ніколі нікому не пагражалі і пагражаць не збіраемся. Але бараніць сваю краіну мы будзем. Мы проста абавязаны гэта рабіць… Бо мы разумеем, што фашызм і нацызм паднімаюць галовы. І паглядзіце, з якой сілай. Сёння, як ніколі, міралюбівая палітыка любой дзяржавы вельмі важная.

Менавіта ў гэтыя гады кожнаму з нас трэба як ніколі разумець, што краіна — гэта ўсе мы, зазначыла Наталля Качанава. І мы павінны зрабіць правільны выбар, каб зберагчы ўсё тое, што пабудавалі за часы самастойнасці. Гэта і якаснае медыцынскае абслугоўванне, якое ўдасканальваецца кожны год, і добрая адукацыя, і грамадская бяспека…

Сапраўды, першачарговая задача перад грамадствам сёння — захаваць адзінства і тым самым захаваць мір і спакой у краіне. Захаваць свае традыцыі — нашы, беларускія, — а не ісці следам за навязанымі звонку трэндамі і фальшывымі каштоўнасцямі. І ўсё гэта залежыць толькі ад нас, ад нашага выбару. Дарэчы, менавіта тэма выбарчай кампаніі стала сутнасцю першага пытання да Старшыні Савета Рэспублікі.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## Якія пытанні задавалі завадчане

***— Ці варта чакаць спроб дэстабілізацыі абстаноўкі падчас выбарчай кампаніі?***

*— Так, спробы будуць, ужо ёсць. Яны (збеглыя. — **«Зв.»**) ж не працуюць, як вы, ля станка. Яны за мяжой на краіну льюць бруд, а ім за гэта грошы плацяць. Таму што гэта брудная палітыка хлусні. Іх выдуць, як на павадку, супраць сваёй краіны і народа.*

*Але сілавы блок, Прэзідэнт — Галоўнакамандуючы нашай краіны зробяць усё, каб гэтага не дапусціць. Каб у краіне захаваліся мір і спакой.*

***— Мінулы год для нас усіх быў напоўнены падзеямі. Якую падзею 2023 года вы лічыце найважнейшай?***

*— Самае галоўнае для нас у 2023 годзе, што мы захавалі мір і спакой у нашай краіне… Мы з вамі жылі і працавалі ў нармальнай эканамічнай сітуацыі — забяспечылі харчовую бяспеку, стабільнасць, працавалі школы, ахова здароўя.*

*Адной з галоўных падзей назаву Пасланне Прэзідэнта да парламента і народа, калі Аляксандр Рыгоравіч выступіў вельмі магутна, ярка. Мне заўсёды гэта западае ў душу.*

*Што датычыцца работы Савета Рэспублікі, то правялі шмат розных мерапрыемстваў — пасяджэнні кансультатыўнага савета па дзецях з асаблівасцямі (дасягнулі многіх вынікаў, і многія людзі нам дзякуюць), Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, Першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум, бралі ўдзел у пасяджэннях Міжпарламенцкай асамблеі СНД…*

***— Я думаю, што кожнага беларуса непакоіць сітуацыя ў нашых суседзяў ва Украіне. Якія вашы прагнозы па завяршэнні спецыяльнай ваеннай аперацыі?***

*— Гэты канфлікт мог бы скончыцца даўно. Трэба проста сесці за стол перагавораў. Калі пачаўся канфлікт, у нас у Беларусі было праведзена некалькі раўндаў перагавораў. І можна было проста дамовіцца.*

*Не будзе для Украіны перамогі. «Донары» іх падсілкоўвалі, але ніхто ж бясплатна нікому ўзбраенне не дае. Усё, што ім сёння шпігуюць, — потым з Украіны запатрабуюць. Вы думаеце, украінцы хочуць гінуць? Вядома не, але ў іх выйсця няма. Хто б мог падумаць некалі, што такое можа адбывацца?! Сесці за стол перагавораў з Расіяй — іншага выхаду з сітуацыі няма.*

*Памятаю словы нашага Прэзідэнта пры звароце з Пасланнем да парламента і народа ў сакавіку 2023 года: калі адказваеш за сваю краіну, народ, калектыў, калі ты кіраўнік, — трэба часам нават наступіць сабе на горла, але зрабіць так, як будзе правільна на карысць тых, за каго ты адказваеш…*

*Трэба спыняць гэтыя гарачыя канфлікты, гэта вядзе толькі на разбурэнне. Дай бог, каб толькі розум перамог.*

ДЭПУТАЦКІЯ БУДНІ

# ПРЫЯРЫТЭТЫ ТЫЯ Ж...

## Старшыня Магілёўскага аблсавета Ірына РАІНЧЫК правяла ў Дрыбінскім раёне прыём грамадзян і сустрэлася з працоўным калектывам

**СЁННЯ высілкі народных выбраннікаў накіраваныя на яшчэ больш цеснае ўзаемадзеянне з насельніцтвам, павышэнне прававой дасведчанасці грамадзян і тлумачэнне пытанняў, якія датычацца Адзінага дня галасавання. Нядаўна з жыхарамі Дрыбінскага раёна сустрэлася старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына Раінчык.**



Падчас выступлення ў райвыканкаме яна яшчэ раз нагадала, як важна ўважліва ставіцца да праблемных пытанняў і вырашаць іх яшчэ на перашапачатковым этапе.

— Паспяховае вырашэнне гэтых задач у многім залежыць ад таго, наколькі эфектыўна вядзецца работа з насельніцтвам, — падкрэсліла яна. — Галоўнае — правільна расстаўляць прыярытэты, плануючы сваю дзейнасць, працаваць на апярэджанне праблемных пытанняў, захоўваць дысцыпліну і сабранасць.

Ірына Анатольеўна нагадала аб задачах на 2024 год, якія пастаўлены губернатарам Магілёўскай вобласці Анатолем Ісачанкам на сустрэчы з актывам рэгіёна. «Прыярытэты рэгіянальнага развіцця нязменныя: жыллё, камфортнае асяроддзе, дарогі, — падкрэсліла яна. — Новы час патрабуе новых падыходаў і канкрэтных рашэнняў».

У ходзе сустрэчы былі абмеркаваны некаторыя моманты дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў, ход падрыхтоўкі да выбараў, асаблівасці работы ў Год якасці. Адной з ключавых стала тэма работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб і выкананне патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва» ў Дрыбінскім раёне ў мінулым годзе.

Ірына Раінчык таксама правяла ў раёне Адзіны дзень інфармавання і выязны прыём грамадзян. На прыёме да яе звярнулася мясцовая жыхарка з пытаннем, якое датычылася жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Праблема разглядалася пры ўдзеле старшыні Дрыбінскага райвыканкама Дзмітрыя Чыгіра і старшыні райсавета Святланы Завідоўскай.

У ходзе размовы была дэталёва вывучана праблема жанчыны, зварот узяты на кантроль да поўнага яго вырашэння.

Нагодай для сустрэчы з супрацоўнікамі Дрыбінскага райцэнтра па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый стала тэма Адзінага дня інфармавання «Год якасці — залог поспеху сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны».

— У Беларусі дасягненне якасці ва ўсіх сферах жыццядзейнасці краіны з самага пачатку было вызначана найважнейшай задачай дзяржаўнай палітыкі, — нагадала Ірына Раінчык. — У беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі якасць разглядаецца ў першую чаргу з пазіцыі якасці жыцця людзей.

Размова таксама ішла аб нованаўвядзеннях у сферы працоўных адносін з 1 студзеня 2024 года, прафілактыцы злачынстваў, звязаных з палавой недатыкальнасцю і палавой свабодай непаўналетніх, асноўных правілах бяспекі жыццядзейнасці ў зімовы перыяд.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва абласавета дэпутатаў.**



ЭКАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

# АХОЎНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ДЛЯ ЖУРАЎЛЯ І ДЗЯТЛА

## Мясцовыя выканкамы прымаюць рашэнні аб ахове месцаў пражывання птушак-чырванакніжнікаў

**НЯДАЎНА адпаведнае рашэнне прыняў Пінскі райвыканкам. Дакументам прадугледжана ўзяць пад ахову месцы пражывання трохпалага і беласпіннага дзятлаў, а таксама вераб'інага сыча, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Птушкі заўважаны ў кварталах Малаплотніцкага, Клятнянскага, Парэцкага лясніцтваў Целяханскага лягаса.**

Як паведаміў карэспандэнту газеты **галоўны ляснічы Целяханскага лягаса Руслан ШАГОЙКА,** ахова птушак азначае перш за ўсё асаблівы рэжым вядзення гаспадарчай дзейнасці ў арэоле іх пражывання. Супрацоўнікі лясніцтваў строга прытрымліваюцца ахоўных абавязацельстваў у плане правядзення нарыхтоўкі лясных рэсурсаў, выканання лесагаспадарчых і меліярацыйных работ.



Руслан Анатолевіч падкрэсліў, што вопыт такой работы ў лягаса ёсць. Гаспадарнікі кіруюцца ў сваёй дзейнасці Лясным кодэксам Рэспублікі Беларусь і Законам «Аб змяненніЛяснога кодэкса Рэспублікі Беларусь», які быў прыняты летась і ўступіў у сілу ў студзені бягучага года. Закон якраз накіраваны на ўдасканаленне пытанняў аховы лясоў і прыроды ў цэлым — роля мясцовай улады ў гэтай справе ўзрастае.

Ну і грамадскасць не застаецца ў баку ад добрай справы. Варта сказаць, што многія школы Пінскага раёна надаюць значную ўвагу экалагічнай адукацыі вучняў. Скажам, у Сошненскай сярэдняй школе ўжо шмат гадоў працуе аб'яднанне па інтарэсах «ЛЕСавічОК». **Дырэктар школы Святлана ХАНДРЫКА** расказала карэспандэнту газеты, што дзеці разам з педагогамі і бацькамі робяць кармушкі для птушак, праводзяць назіранні, ладзяць акцыі па зімовых падкормках крылатых сяброў і сустрэчы птушак вясной: «Тым самым мы выхоўваем у вучняў любоў да прыроды, уменне назіраць за навакольным асяроддзем. На занятках гуртка школьнікі атрымліваюць экалагічныя веды, якія і служаць асновай беражлівага стаўлення да прыроды, у нашым выпадку — да птушак», — падкрэсліла Святлана Васільеўна.

Дарэчы, днямі Бярозаўскі райвыканкам сваім рашэннем перадаў пад ахову месцы пражывання вусатай сініцы і шэрага жураўля. Птушкі, занесеныя ў Чырвоную кнігу, заўважаны на землях трох карыстальнікаў зямельных участкаў. Вусатая сініца адзначана на землях ААТ «Міжлессе», Бярозаўскай машынна-тэхналагічнай станцыі і сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Савушкін-Прамень». Пад ахову перададзена амаль 57 гектараў. Шэры журавель пражывае на ўчастку амаль у 40 гектараў тэрыторыі ААТ «Міжлессе». На ўказаных участках устанаўліваецца асаблівы рэжым аховы і выкарыстання. Названыя гаспадаркі бяруць на сябе ахоўныя абавязацельствы. Ну а мясцовая ўлада выступае ў ролі каардынатара работы.

— Наша функцыя ў гэтым пытанні больш асветніцкая, выхаваўчая, а таксама інфармацыйная, — гаворыць **старшыня Міжлескага сельскага Савета Бярозаўскага раёна Юрый КАШТАЛЯН.** — На сходах грамадзян будзем яшчэ раз нагадваць, тлумачыць, заклікаць ні ў якім разе не выпальваць сухую траву вясной. Апошняе смяротна небяспечна для птушак-чырванакніжнікаў. На асобных участках нельга прымяняць угнаенні і сродкі аховы раслін у перыяд з 15 красавіка да 31 ліпеня ўключна. Гэта датычыцца не толькі сельгаспрадпрыемстваў, але і фермераў, прыватных гаспадароў. Выканкам даводзіць інфармацыю да зацікаўленых асоб, а вялікай асветніцкай работай у экалагічным кірунку займаецца школа. На нашай тэрыторыі функцыянуе Сігневіцкая сярэдняя школа. Там ёсць адпаведныя гурткі, факультатывы. Добра, што дзеці выхоўваюцца ў духу павагі да прыроды. Інакш і быць не можа ў нашай мясцовасці: побач — Спораўскі заказнік, іншыя запаведныя мясціны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.**

Тыраж 12.292. Нумар падпісаны ў 19.30 23 студзеня 2024 года.

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# МАГІЛЁЎ




Магілёў. Свята-Іосіфаўскі кафедральны сабор (пач. XX стагоддзя).

**Магілёў — з тых беларускіх гарадоў, чыю даўніну магчыма хутчэй уяўляць, карыстаючыся многімі гістарычнымі крыніцамі, чым адкрыта з ёю сустракацца. Войны, асабліва Вялікая Айчынная, даўнія часы знявагі да гістарычных помнікаў — усё гэта зрабіла сваю справу, раструшчыўшы многія, здавалася б, трывалыя матэрыяльныя памяткі пра іншыя эпохі.**

Узнаўляючы нешта пэўнае ў свядомасці, нельга не звяртацца да лёсаў нашых суайчыннікаў. Іх жыцці — крыніца ўвагі да гістарычных мясцін. Па крупельках збіраю, напрыклад, інфармацыю пра аднаго з нашых суродзічаў. Можа, спадзяюся, дзе ў звязцы з адкрыццём яго біяграфіі і ўсплыве яшчэ ўяўленне пра даўні Магілёў... З дваран Магілёўскай губерні — Міхаіл Іванавіч Лявіцкі. Нарадзіўся ў 1761 годзе. Асоба яркая, шматаблічная, хоць усё жыццё займаўся адным галоўным клопатам — ваяваў з ворагамі Расійскай імперыі. У лістападзе 1781 года ўступіў падпрапаршчыкам у Полацкі пяхотны полк. Удзельнічаў у руска-турэцкай вайне 1787—1792 гадоў. Вызначыўся пры штурме Ачакава. Пасля ўдзельнічаў у бітве пры Каўшанах, ва ўзяцці Акермана. Штурмаваў Ізмаіл. Потым служыў у Польшчы, ваяваў з паўстанцамі Касцюшкі. У 1798 годзе магіляўчанін быў прызначаны камандзірам Кіеўскага грэнадзёрскага палка. У 1803 годзе атрымаў чын генерал-маёра. З мая таго ж года — шэф Падольскага мушкецёрскага палка. Ваяваў пры Аўстэрліцы, змагаўся з французамі ва Усходняй Прусіі ў 1806—1807 гадах, быў адзначаны ордэнам святога Георгія 4-й ступені. Атрымаў і ад прускага караля ордэн — «Pour le Merite». З кастрычніка 1810 года — камандзір 3-й брыгады 7-й пяхотнай дывізіі. Незадоўга перад Барадзінскай бітвай быў прызначаны камендантам Мажайска. У 1814 годзе Лявіцкі — камендант Варшавы. У 1829-м наш зямляк атрымаў чын генерала ад інфантэрыі. У адстаўку выйшаў у 1831 годзе. Засталося знайсці мемуары генерала-земляка. І, можа быць, там будуць памяткі пра стары Магілёў і яго ваколіцы?..

Цікавы лёс у Астрарога Станіслава Юльяна, які нарадзіўся ў Магілёве ў 1830-м, а памёр у Лондане ў чэрвені 1890 года. У цянётах гісторыі наш зямляк застаўся як палкоўнік Асманскай арміі ў Турцыі, англійскі вынаходнік і фотамастака, а яшчэ як паэт. Вось колькі адразу жыццёвых «фарматаў»!.. Нарадзіўся Станіслаў у сям'і міравога суддзі Антона Астрарога. Пасля паўстання 1830—1831 гадоў разам з бацькамі эміграваў у Францыю. Прыняў удзел у Крымскай вайне 1853—1856 гадоў як капітан дывізіі султанскіх казакоў пад камандаваннем англійскага генерала Генры Найта Сторкса. У 1854-м — палкоўнік асманскай арміі. Пасля Крымскай вайны — у Англіі. Прыняў брытанскае грамадзянства. У Англіі займаўся вынаходніцтвамі ў розных галінах навукі і тэхнікі. Пасля на некаторы час перасяліўся ў Парыж. Заснаваў фатаграфічную фірму «Walery». Пісаў і друкаваў вершы на польскай мове. Вярнуўся ў Англію, адкрыў фотасалон, рабіў партрэты многіх знакамітасцяў.




Магілёў. Шклоўскі рынак (пач. XX стагоддзя).




Магілёў. Тэатральная плошча (пач. XX стагоддзя).

З больш маладзейшых сведкаў гістарычнага сталення Магілёва — Ісай Шур, які нарадзіўся ў 1875 годзе. У біяграфіі розных краін ён застаўся як вучоны, матэматык. Бацькі Ісая — магіляўчане Моша Шур і Голда Ландау. Прозвішча маці вымушае задумацца пра блізкія сувязі з геніяльным Ландау. Але гэта — тэма асобнай гаворкі. Ісай закончыў Берлінскі ўніверсітэт. Вучыўся ў легендарнага Л. Фукса. Ужо ў 1901 годзе атрымаў ступень доктара навук. З 1910-га — прафесар Берлінскага ўніверсітэта. Вага ў навуковым свеце была ў нашага земляка настолькі вялікая, што ў 1929 годзе яго выбіраюць замежным членам-карэспандэнтам Акадэміі навук СССР. У 1938-м Шура выключылі з Прускай акадэміі навук. На шчасце, вучонаму ўдалося ўцячы ў Палесціну, дзе ён пасля і працаваў выкладчыкам Яўрэйскага ўніверсітэта ў Іерусаліме. Матэматыкі ведаюць і тэарэму Шура.




Магілёў. Вакзал (пач. XX стагоддзя).

Яшчэ адзін магіляўчанін, пра след якога нельга не згадаць, — піяніст, канцэртмайстар Міхаіл Барысавіч Борхес. Нарадзіўся ў горадзе на Дняпры ў чэрвені 1909 года. У 1931 годзе скончыў Ленінградскую кансерваторыю, а затым і аспірантуру ў ёй. З 1943 да 1957 года ўключна быў акампаніятарам славутага Аляксандра Вярцінскага. Іх гастролі праходзілі па самых розных кутках Савецкага Саюза. Вярцінскі высока цаніў выканальніцкую манеру нашага земляка. Борхес самастойна, па пласцінках, вывучыў усе песні Вярцінскага, калі артыст яшчэ быў у эміграцыі. І вось так склалася, што лёс звёў двух таленавітых людзей. І ўжо пасля смерці спевака Борхес падрыхтаваў сольную праграму «Чатырнаццаць гадоў з Вярцінскім», якая мела вялікі поспех. Піяніст іграў і спяваў, тонка перадаючы манеру Вярцінскага, тэмбр яго голасу. Захавалася сведчанне, што нават Сталін быў захоплены майстэрствам піяніста.




Магілёў. Мураўёўскі сквер (пач. XX стагоддзя).




Магілёў. Від на горад і параходную прыстань (канец XIX стагоддзя).

Параўнальна нядаўна я пазнаёміўся яшчэ з адным магіляўчанінам. Ліставаўся з ім. Прозвішча — Бязлепкін. Завуць Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў Магілёве ў 1950 годзе. Закончыў Ленінградскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча (1972), а затым — філасофскае аддзяленне ваенна-педагагічнага факультэта Ваенна-палітычнай акадэміі (1980), ад'юнктуру кафедры філасофіі Ваенна-палітычнай акадэміі (1985). У тым жа годзе Мікалай Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю «Мова ваеннай навукі як сродак пазнавальнай дзейнасці ваенных кадраў (філасофска-методалагічны аналіз)». У 1999 годзе — доктарскую дысертацыю «Філасофія мовы ў Расіі (XIX — сярэдзіна XX стагоддзя)». У 1968—2001 гадах Бязлепкін служыў ва Узброеных сілах СССР і Расійскай Федэрацыі: выкладчык, старшы выкладчык кафедры грамадскіх навук Ленінградскага вышэйшага зенітнага ракетнага каманднага вучылішча, выкладчык, старшы выкладчык, намеснік начальніка кафедры, начальнік кафедры гуманітарных і сацыяльна-эканамічных дысцыплін Міхайлаўскай ваеннай артылерыйскай акадэміі. Палкоўнік запаса. З 2000 года Мікалай Іванавіч адначасова працуе на кафедры гісторыі рускай філасофіі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2000—2005 гадах — прафесар кафедры гісторыі рускай філасофіі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2001—2003 гадах — дэкан факультэта сацыяльнага кіравання Санкт-Пецярбургскай акадэміі кіравання і эканомікі. У 2003—2006 гадах — прарэктар па навуковай рабоце Санкт-Пецярбургскай акадэміі кіравання і эканомікі. З 2006-га — загадчык кафедры філасофіі Санкт-Пецярбургскай акадэміі кіравання і эканомікі. Бязлепкін —- аўтар манаграфій «Мова ваеннай навукі як сродак пазнавальнай дзейнасці ваенных кадраў» (1985), «Філасофія мовы ў Расіі : вопыт гісторыка-тэарэтычнай сістэматызацыі» (1999), «Філасофія мовы ў Расіі (XIX — сярэдзіна XX стст.)» (1999), «Філасофія мовы ў Расіі: да гісторыі рускай лінгвафіласофіі» (2001, 2-е выд. — 2002) і болей чым 50 навуковых артыкулаў. Кола навуковых зацікаўленняў нашага земляка: актуальныя праблемы грамадскага развіцця, філасофска-метадалагічныя праблемы ваеннага кіравання, асновы лінгвакультуралогіі, руская культуралогія: агляд асноўных тэорый, філасофія мовы, этыка і эстэтыка, гісторыя філасофскай навукі, гісторыя і філасофія навукі, метады навуковых даследаванняў. Член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі вышэйшай школы. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «300 год Санкт-Пецярбургу».

Дык вось у нашым ліставанні з Бязлепкіным мы часта згадвалі розных ураджэнцаў Магілёва. Часам новым адкрыццям здзіўляецца Мікалай Іванавіч, часам я радуюся, што з падказкі вучонага некага заношу ў сваю памяць, а магчыма, і адкрываю для Беларусі, нагадваю чытачам, пра каго мы забыліся. І неяк Мікалай Іванавіч выказаў такую прапанову: «А чаму б не ўшанаваць многіх землякоў, назваўшы іх імёнамі вуліцы Магілёва?» Давялося мне звярнуцца да гарадской тапанімікі абласнога горада. І, канешне ж, прывёў некалькі прыкладаў, калі з вуліцамі Магілёва звязана памяць пра яго славутых ураджэнцаў...

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

*Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава.*

# «ЗАВАЛІЎ НАС СНЕЖАНЬ СНЕГАМ. Хто такога мог чакаць?..»

**Што было — было. Яўрэйскі доктар не змог знайсці работу ў амерыканскіх бальніцах — вырашыў адкрыць сваю невялікую прыватную клініку. Перад уваходам у яе размясціў рэкламны плакат з надпісам: «Тут вы атрымаеце лячэнне за 20 долараў. Калі яно не дапаможа, мы вернем вам сто».**
**Амерыканскі юрыст вырашыў, што гэта — нядрэнная магчымасць зарабіць! Ён зайшоў у клініку і паскардзіўся, што ў яго прапаў смак. Доктар выслухаў, папрасіў медсястру прынесці лекі з каробкі 22 і дзве кроплі капнуць на язык пацыенту. Юрыст пасмакаваў і зморшчыўся: «Фу... Дык гэта ж газа!» Доктар з радасцю: «Віншую! Да вас вярнуўся смак!.. З вас 20 долараў».**
**Засмучаны юрыст заплаціў, але праз тыдзень захацеў вярнуць свае грошы. Ён прыйшоў у клініку і паскардзіўся, што страціў памяць. Доктар папрасіў медсястру прынесці лекі з каробкі 22... Юрыст абурана перапыніў: «Дык гэта ж газа! Вы яе давалі мінулы раз, калі я скардзіўся на страту смаку». Доктар пераможна ўсміхнуўся: «Цудоўна, да вас вярнулася памяць! З вас 20 долараў».**
**Юрыст яшчэ раз аддаў грошы, але праз тыдзень з'явіўся зноў, каб атрымаць такі сто долараў. Трагічным голасам ён сказаў, што ў яго сапсаваўся зрок — ён амаль нічога не бачыць! «Спачуваю, — цяжка ўздыхнуў доктар, — аднак ад гэтай хваробы лекаў пакуль няма. Вось, вазьміце вашы сто долараў». Юрыст (з гневам гледзячы на банкноту): «Але ж гэта 20, а не 100!» Доктар (з палёгкай): «Віншую... Ваш зрок вярнуўся! З вас 20 долараў».**
**Гэта мы да таго, што»Звязда» больш як 20 гадоў друкуе адмысловыя здымкі і за гэта (як той доктар з юрыста) «бярэ» з чытачоў 20 (плюс-мінус) варыянтаў подпісаў. Зазначым, што прыходзіць іх намнога больш, друкуецца — хіба найлепшае.**

«Помню, па маладосці, — успамінае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**, — прыехаў я ў адзін з калгасаў Палесся працаваць намеснікам старшыні, стаў там азірацца, знаёміцца з людзьмі і хутка даведаўся, што сярод іх ёсць мясцовая славутасць — дзед Рыгор, які на любую навіну адгукаецца вершаванымі радкамі. Спачатку я пачуў толькі два: «У снежні мы скасілі жыта, і было ўсё шыта-крыта». Папытаўся ў старшыні, няўжо гэта праўда. «Ды быў такі грэх, — смяецца ён. — Пасеялі жыта на асушаных тарфяніках, а ўбраць не паспелі: зададжджыла так, што носа не ўткнуць! Некалькі гектараў у полі засталося... Знайшоўся «добразычлівец» — ананімку ў райкам напісаў. Свае людзі адтуль званочак: днямі прыедзе праверка. Што было рабіць? Мусіў на тую няхватую паласу камбайн паслаць — пазбіваць калоссе... Адразу пасля яго мяцеліца «прайшлася»... Камісія прыехала, паглядзела — на полі ніякага жыта: факт не пацвердзіўся».

— Успомніўшы гэты выпадак, — працягвае Валерый Мікалаевіч, — я і да здымка напісаў:

*Што ж — зіма змяніла восень,*
*А мы косім, косім, косім!*

Такое, на думку **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў**, на жаль, здараецца:

*Хто-ніхто не паспявае*
*З поля звезці ўраджай.*
*А як снегам замятае,*
*Хоць касі, хоць пахавай.*

І адно, згадзіцеся, не мёд, і другое не рэдзька. А таму, як сцвярджае **спадар Гаўрыш**:

*Касіць зімой не бачу толку,*
*Занятак той — курам на смех!*
*Таму, браток, кідай літоўку,*
*Бяры лапату — чысці снег.*

Іншая парада — ад **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска**:

*Заваліў нас снежань снегам.*
*Хто такога мог чакаць?*
*Не касіць, браточкі, трэба,*
*А цяпліцы ратаваць!*

(Два першыя радкі можна прачытаць яшчэ раз... І пашкадаваць, напрыклад, японцаў, у якіх месяцы не маюць назваў, толькі нумары: той, шосты, калі ў нас косяць, называецца рокацу). А наогул...

Біблейскі Саламон у прытчах пісаў, што для ўсякай справы ёсць свой час: час раскідваць камяні і час збіраць, час смяяцца і плакаць... Праўду пісаў, згаджаецца спадар Гаўрыш і ад сябе дадае: «...час касіць і час косы кляпаць». Адкуль (і ўжо рыфмаваным радком):

*Сказаў правіцель Саламон:*
*Што ўсякай справе — пэўны час.*
*Калі казаў, не ведаў ён,*
*Што часам*
*правіць КАМУНГАС,*
*Там не чыталі Саламона,*
*І гэты цар ім не ўказ.*

Ці не пра тое ж, але іншымі словамі **спадар Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка**:

*У нас зіма цяпер такая:*
*Снег то ляжа, то знікае...*
*І скасіць тады траву,*
*Можа, і стрэльне ў галаву?*

Ёсць пытанне, у чыю — канкрэтна?.. І ў тым самым канверце — адказ:

*Распарадчыкі — гурмой!*
*А мазгоў — бывае, мала:*
*Вось і косім — хоць зімой —*
*Раз начальства загадала.*

І маем потым, што... маем. Сёлета, напрыклад, па назіраннях **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**,

*Разам з лісцем снег упаў,*
*Схамянуўся і растаў:*
*Хтосьць на небе пэўна зглездзеў,*
*Што не скошана*
*шмат траў.*
*Кукуруза на палях...*
*А з кармамі —*
*справы швах.*

То-бок дрэнна (месцамі). Але ж не безнадзейна, паводле **спадара Юрыя Вінаградава з Докшыцкага раёна**):

*Мусіць, вынайшла навука,*
*Як зімой касіць траву...*



Фота Андрэя Феакціства.

*І камусьці гэта штука*
*Ускружыла галаву.*

Прычым настолькі, на думку **спадарыні Чыгрынавай**, што:

*Дождж ідзе,*
*А мы скірдуем,*
*Снег ляжыць,*
*А мы ўсё косім.*
*Без кармоў*
*зрэдчас гаруем*
*І крэдыты*
*ў банку просім.*

Што, між іншым, лагічна: ці не любая бяда вядзе ў даўгі, ці не любыя даўгі — у бяду. (З назіранняў бывалых: калі размова пра твой доўг дзяржаве, то, хоць памры, але заплаці, калі размова пра доўг дзяржавы табе, — то, хоць памры, але дарый). Гэта — кажучы прозай. Калі ж вершаваным радком, то, мусіць, найлепш — ад Максіма Танка:

*Добры мёд на памінках,*
*Толькі ніхто не пяе.*
*Добры рубель пазычаны,*
*Толькі спаць не дае...*

(З дыялогаў: «Як лічыш, чорная паласа ў маім жыцці калі-небудзь скончыцца?» — «Ну вядома! Жыццё ж не вечнае!»)

І зіма, на шчасце, таксама! Ледзь не з пачатку студзеня народ пачынае «тусіць» у адмысловых крамах: дачнікі ды вяскоўцы (цікава, каго цяпер больш?) выбіраюць насенне, купляюць зямлю для расады. А таму не дзіва, што **сужэнцы Астроўскія**, глянуўшы на здымак (можна і вам... яшчэ раз), пытаюць:

*Хто смяецца там? Ды гучна?*
*А з чаго? Нагода?*
*Гэта ж просьба стане слушнай*
*Недзе праз паўгода.*
*Пойдзе зноў трава расці,*
*Касавіца — будзе!*
*Таму заклік хай вісіць —*
*Берагуцца людзі.*

А то — не дай бог — касавіца прыйдзе, а касцоў няма...

Пра тое ж і **спадар Аляксандр Матошка з Расоншчыны**:

*Гэты заклік чакае вясны,*
*Калі ўздымуцца травы ў росах.*
*Будзе праца тады для касы,*
*А пакуль хай стаіць сабе коса.*

Трэба разумець, плакат? Ці каса?

Шматзначнае апошняе слова, бо гэта і сельгаспрылада, і доўгія заплеценыя валасы, і вузкая мель, і палоска чаго-небудзь, і (размоўнае) селязёнка...

Адкуль, трэба разумець, цалкам лагічныя развагі ад сужэнцаў Астроўскіх:

*Асаблівасць нашай мовы:*
*Шмат значэнняў маюць словы.*
*У касавіцу людзі косяць*
*І дажджу тады не просяць:*
*Сена трэба насушыць,*
*Каб дугою не касіць...*
*А грыбы... Дай бог — касою!*
*Але ж гэта*
*— не зімою,*
*Бо зімою косіць грып:*
*Сцеражыся, каб не ўліп!*

Такім чынам, у заклiку і сапраўды нічога смешнага. Хутчэй наадварот... Як і ў размове жанчын, якую падслухаў **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды**:

*— Дзе Пятра нячысцік носіць?*
*На заробкі з'ехаў, пэўна?*
*— Не, ён зноўку нешта косіць...*
*— Што — зімой?!*
*— Сабакам сена...*

Шмат, на жаль, такіх аматараў, шмат матуль, якія застаюцца з дзецьмі і выхоўваюць іх як могуць. Адзін сынок, расказвалі, вельмі дрэнна вучыўся — пасля школы збіраўся ісці працаваць. А хоць бы і дворнікам! Маці «падмітусілася» — дамовілася з адным, каб узяў хлапчо ў напарнікі — за плату, на тыдзень... А тут якраз заснежыла, ды так...

Карацей, давялося дворнікам папацець, звездаць, пачым фунт ліха, а хлапцу яшчэ — і высновы зрабіць. Паводле **спадара Сабалеўскага**:

*Рос хлапчук у мамкі спраўненькі,*
*Ды гультай — усім вядомы:*
*Летам*
*марыў быць настаўнікам,*
*А зімою — аграномам...*
*Адвучыўся, уладкаваўся —*




*Дастаткова мух у носе:*
*У сталічным зелянгасе*
*І зімой ён штосьці «косіць».*

З тога ж канверта — і ў знак павагі да людзей старэйшага пакалення — яшчэ восем радкоў:

*Дзед Мікола малайчына:*
*Скошваў травы, канюшыну,*
*У гародчыку паўмежкі...*
*Замяло да хаты сцежкі —*
*Дочкі ў горад дзеда ўзялі.*
*Хоць ты плач на тым балконе!..*
*Ды касу ж не прыхавалі?*
*На работу выйдзе сёння!*

На касьбу...

І — дададзім — з рознымі там абвесткамі, бо, як пішуць **сужэнцы Астроўскія**:

*Падлічыць ніхто не можа,*
*Колькі ў нас такіх аб'яў:*
*Нехта некалі размножыў,*
*Наляпіў і не прыбраў.*

Чаму? Ды проста (паводле **спадара Гаўрыша**):

*Даўно сабраны вінаград,*
*Даўно мінуўся лістапад,*
*Сады сняжком пакрыліся...*
*Усе косы*
*здалі мы на склад...*
*А шыльду здаць — забыліся.*

І тым самым трохі павесялілі жыхароў мікрараёна ды чытачоў «Звязды», бо, як заўважыў **спадар Мікалай Старых з Гомеля**:

*Плакат на мове роднай —*
*Прыемна паглядзець!*
*Таму — зімой і летам —*
*Дай бог яму вісець!*

Вось на гэтай аптымістычнай ноце і скончым чарговы агляд. Што датычыцца мінулага здымка (гл. нумар «Звязды» за 13 снежня 2023 г.), то найлепшыя радкі пра пару валёнак, пару колаў і пару прыгожых дзявочых ножак, паводле вялікага чытацкага журы, даслалі **спадарыні Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны і Алена Войцік з Гродна, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадары Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Аляксандр Матошка з Расонскага раёна і Юрый Вінаградаў**...

З гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае, а значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на другі квартал бягучага года накіроўваецца ў Докшыцкі раён.

Хочаце, каб родная газета на роднай мове пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо афармляць падпіску (на месяц, на два, на квартал), альбо ўважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак (унізе), прыдумаць подпіс (можна некалькі, але дасціпных, кароткіх) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж*** (і сужэнцаў Астроўскіх) неабходнае тлумачэнне: можна касіць дугой — гэта значыць, не назапасіўшы корму для жывёлы, выпрошваць, купляць, пазычаць яго, можна — ад войска, а можна яшчэ і вокам — то-бок заглядаць на чужых мужоў ды жонак, з чым таксама варта асцярожнічаць, бо, як папярэджвае прыказка «...не скасееш дык здурнееш». Гэта — па-першае. Па-другое, шчырае, спадзяёмся, прызнанне ад **спадарыні Ніны Бурко з Бярэзіншчыны**:

*Звяздоўскі конкурс «Хто каго?» —*
*Бальзам для сэрца, для майго!*
*З ім — трэніроўка для мазгоў,*
*Якой чакаеш зноў і зноў!*
*А калі так — пішыце!*

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

УРАЧ-ТРАЎМАТОЛАГ:

Будзьце пільныя!

# «БАЦЬКІ ПОТЫМ ІРВУЦЬ НА САБЕ ВАЛАСЫ І КУСАЮЦЬ ЛОКЦІ...»



**Сёлетняя зіма выдалася снежнай, і для дзяцей гэта разнастайныя магчымасці для зімовых забаў. Катанне з горак на санках, лядзянках, цюбінгах прыносіць ні з чым не параўнальнае задавальненне, але часам, на жаль, здараюцца і трагедыі. Цягам шэрагу апошніх гадоў у лідарах па траўміраванні знаходзяцца цюбінгі. Медыкі не стамляюцца папярэджваць аб небяспеках, аднак пазбегнуць нешчаслівых выпадкаў не ўдаецца.**

Як адзначае **начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі Генеральнай пракуратуры Вікторыя ФІНЕВІЧ**, з выпадзеннем снегу і ўстанаўленнем мінусавых тэмператур пагаршаецца сітуацыя з траўміраваннем дзяцей. З пачатку сезона больш за 200 непаўналетніх атрымалі траўмы пры катанні на цюбінгах, санках і лядзянках. Пры гэтым 65 дзяцей атрымалі цяжкія траўмы, звыш 2 тысяч дзяцей атрымалі галалёдныя траўмы.

Часам зімовыя забавы прыводзяць да цяжкіх наступстваў. Сёлета 7 студзеня пасля катання з горкі на цюбінгу ў гродзенскую бальніцу з чэрапна-мазгавой траўмай і лінейным пераломам касцей зводу чэрапа шпіталізавана шасцігадовая дзяўчынка. 14 студзеня гэтага года пасля катання на цюбінгу ў Лагойску васьмігадовы хлопчык з надзвычай цяжкімі траўмамі таксама быў шпіталізаваны.

— Калі пэўная бестурботнасць дзяцей нам зразумелая, то грэбаванне бацькамі элементарнымі правіламі бяспекі і часам поўная бескантрольнасць за паводзінамі дзяцей выклікаюць занепакоенасць. Прыклады таму — ролікі з сеткі інтэрнэт з прывязваннем цюбінга да машыны, катанне на схілах каля аўтамабільнай дарогі, — кажа Вікторыя Фіневіч.

Пры гэтым і ў сталіцы, і ў іншых рэгіёнах мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы арганізуюць месцы для катання на цюбінгах, санках, лядзянках удалечыні ад аўтамабільных дарог. Іх лакацыі можна паглядзець у інтэрнэце.

Прычынай надзвычайных сітуацый з дзецьмі штогод становіцца тонкі лёд. У Лёзненскім раёне Віцебскай вобласці 3 студзеня дзве школьніцы спрабавалі падняць мабільны тэлефон, які зваліўся на пакрытую лёдам раку, і праваліся пад лёд. Трагедыі цудам удалося пазбегнуць. Дзяўчынкі з дапамогай дарослых змаглі выбрацца і былі шпіталізаваны з агульным пераахаладжэннем.

— Хочацца парэкамендаваць бацькам: у цяперашні час ва ўсіх ёсць гаджэты, дзе можна ўстанавіць дадаткі з бяспечнымі і небяспечнымі зонамі. Гэта дапамога своечасова прадухіліць трагедыю або прыняць неабходныя меры. Акрамя гэтага, хочацца звярнуцца да грамадзян, якія могуць быць выпадковымі сведкамі знаходжання дзяцей у небяспечных месцах на лёдзе. Не будзьце абыякавымі: прaганіце дзяцей, адвядзіце бяду. Не трэба здымаць на тэлефон і выкладваць у інтэрнэт, трэба прадухіліць сітуацыю, прыняць меры для таго, каб не дапусціць трагедыі, — дадаў **намеснік старшыні Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах» (АСВОД), начальнік аддзела рэспубліканскай вадалазна-выратавальнай службы АСВОД Дзмітрый БАРАНОЎСКІ**.

На шчасце, за апошнія тры гады колькасць дзяцей, якія загінулі, памяншаецца.

— У 2023 годзе колькасць дзяцей, загінулых ад знешніх прычын, знізілася на 16 %. Асноўнымі прычынамі смерці сталі ўтапленне, дарожна-транспартныя здарэнні, пажары, падзенне з вышыні, суіцыды і злачынныя дзеянні, — прывяла статыстыку Вікторыя Фіневіч.

Значная колькасць дзяцей траўміруецца і з прычыны дарожна-транспартных здарэнняў — як у якасці пасажыраў транспартных сродкаў, так і ў якасці пешаходаў і веласіпедыстаў. У некаторых выпадках непаўналетнія пешаходы становяцца ахвярамі нецвярозых дарослых. Сумны выпадак адбыўся напярэдадні Новага года ў Гомелі. Нецвярозы вадзіцель на пешаходным пераходзе збіў пятнаццацігадовага падлетка. Пры гэтым кіроўца не толькі не спрабаваў аказаць дапамогу пацярпеламу, але і ўцёк з месца ДТЗ. Было ўстаноўлена, што ў аўтамабілі знаходзіліся яго жонка ў стане алкагольнага ап'янення і непаўналетняя дачка, чые жыцці таксама былі пастаўлены пад пагрозу нецвярозым кіроўцам.

Асобная сітуацыя з цюбінгамі, якія кіроўцы прывязваюць да аўтамабіля, каб пакатаць дзіця. Нядаўна зафіксаваны выпадак, калі бацька сямейства катаў гэткім чынам сваё трохгадовае дзіця і жонку.

— Па-першае, катэгарычна забаронена правіламі перавозкі пасажыраў прывязваць цюбінг да аўтамабіля. Па-другое, гэта не забава, калі вы змяшчаеце дзіця ў цюбінг, які прывязаны да транспартнага сродку. Вы павінны ўсведамляць, што не зможаце яго спыніць і ў выпадку нейкага небяспечнага заносу ці павароту наступствы могуць быць проста трагічнымі, аж да смерці дзіцяці, — папярэдзіла **начальнік аддзялення арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Вераніка РАМАНЬКОВА**.

У чым спецыфіка і асаблівасць траўм, якія атрымліваюць дзеці пры катанні на цюбінгах, расказаў **галоўны пазаштатны дзіцячы траўматолаг-артапед Міністэрства аховы здароўя, вядучы навуковы супрацоўнік РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Дзмітрый ЦЕСАКОЎ**.

— Пры катанні на санках, на лыжах, на сноўбордах патрабуецца пэўны тэхнічны навык, і той, хто катаецца, можа прадпрымаць нейкія дзеянні, калі раптам штосьці пайшло не так. На цюбінгу дзіця не ў стане кіраваць гэтым сродкам. Атрымліваецца так, што малое адчувае адрэналінавы стрэс ад стану некантраляванага стану і пачуцця хуткасці. Добра, калі ўсё добра, але, калі раптам нешта адбываецца не так — страсянула, стукнула, перавярнуўся цюбінг, выкінула дзіця — гэты адрэналінавы стрэс выклікае найцяжэйшы псіхалагічны шокавы кампанент, не кажучы аб тым, што сам чалавек, які траўміруецца, не ў стане сябе неяк абараняць і групавацца.

Урач адзначыў, што ў арганізаваных месцах — спецыялізаваных цэнтрах, дзе кантралюецца траса і адсочваецца яе стан, — практычна няма надзвычайных здарэнняў, толькі адзінкавыя сітуацыі.

Ён дадаў, што з пачатку зімовага сезона з чэрапна-мазгавой траўмай у выніку катання на цюбінгах у дзіцячае нейрахірургічнае аддзяленне РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі на стацыянарнае лячэнне паступілі 42 чалавекі. Там патрабавалася і хірургічная дапамога. У РНПЦ траўматалогіі і артапедыі за гэты перыяд паступілі 17 чалавек, з іх пяць — з цяжкімі пашкоджаннямі. У чатырох — пашкоджанні пазваночніка, адзін пераломам ключыцы і пераломам рукі, што таксама патрабавала хірургічнага ўмяшання.

— Мы часта назіраем, што бацькі, якія не кантралявалі дзяцей, дапусцілі траўміраванне, потым ірвуць на сабе валасы і кусаюць локці, бачачы, якія наступствы, якая траўма, якія далейшыя праблемы для здароўя іх дзяцей. Таму хочацца, каб перш за ўсё дарослыя ўсведамлялі, што яны адказваюць за дзяцей. Ад свайго імя, ад імя сваіх калег траўматолагаў, нейрахірургаў, хірургаў, якія аказваюць спецыялізаваную дапамогу, звяртаюся да бацькоў: кантралюйце паводзіны дзяцей, прычым не толькі сваіх, але ўсіх, хто побач з вамі. Не ідзіце на павадку дзіцячага капрызу, а калі ўжо прымаецца рашэнне пакатацца на цюбінгу, то катанне павінна ажыццяўляцца выключна ў падрыхтаваных, спецыяльна адведзеных, кантраляваных пляцоўках, — рэзюмаваў Дзмітрый Цесакоў.

# ЧАКАЕЦЦА ЎЗДЫМ ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ НА ГРЫП

## Медыкі расказалі пра сітуацыю з рэспіраторнымі інфекцыямі

**Медыкі ацэньваюць інтэнсіўнасць захворвання на ВРІ і грып як сярэднюю з тэндэнцыяй да павелічэння ва ўсіх рэгіёнах краіны. У сувязі з гэтым звяртаюць увагу, што ў паліклініках працягваецца вакцынацыя супраць грыпу, і рэкамендуюць шэраг мер, якія дапамогуць засцерагчыся ад рэспіраторных хвароб.**



Штогод у Беларусі ў перыяд з кастрычніка да красавіка адзначаецца сезонны ўздым захворвання на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, у тым ліку на грып. Цяпер інтэнсіўнасць эпідэмічнага працэсу ВРІ ацэньваецца як сярэдняя з тэндэнцыяй да павелічэння ва ўсіх рэгіёнах краіны. У структуры захварэлых удзельная вага дзіцячага насельніцтва ва ўзросце да 18 гадоў складае больш як 50 працэнтаў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.

Вынікі лабараторных даследаванняў сведчаць аб цыркуляцыі вірусаў грыпу А (H1N1), А (H3N2), А (нетыповага), В і негрыпозных рэспіраторных вірусаў (вірусы парагрыпу, адэнавірусы, рынавірусы, РС-вірусы, сезонныя каранавірусы, CoV-2), што абумоўлівае рызыку распаўсюджвання ўзбуджальнікаў і ўзнікненне выпадкаў захворвання, у тым ліку лакальныя ўспышкі.

У Беларусі праводзіцца пастаянны малекулярна-генетычны скрынінг варыянтаў віруса SARs-CoV-2 з мэтай адсочвання і кантролю за з'яўленнем новых варыянтаў, якія цыркулююць у краіне.

Па наяўных даных, варыянт «Пірола» шырокага распаўсюджвання не атрымаў. У цяперашні час працягваецца пераважная цыркуляцыя двух рэкамбінантных формаў віруса: XBB.1.16 «Арктурус» і EG.5.1.1 «Эрыс».

Такім чынам, развіццё эпідэмічнай сітуацыі па грыпе і ВРВІ ў краіне адпавядае перспектыўнаму прагнозу на эпідэмічны сезон 2023-2024 гадоў. На падставе даных малекулярна-біялагічных даследаванняў можна казаць аб тым, што ў Беларусі адзначаецца сумесная цыркуляцыя вірусаў сезоннага грыпу, SARS-CoV-2 і іншых рэспіраторных вірусаў.

Эпідэміёлагі адзначаюць, што эпідэмічны ўздым захворвання на ВРІ, абумоўлены распаўсюджваннем вірусаў грыпу, можна чакаць у бліжэйшыя тыдні.

— Развіццё ўздыму захворвання на ВРІ, асацыяванага з эпідэмічным распаўсюджваннем грыпу ў канцы студзеня — пачатку лютага, з'яўлялася характэрным па шматгадовых назіраннях для краіны ў дапандэмічны перыяд, што сведчыць аб стабілізацыі сезоннай актыўнасці вірусаў грыпу. Эпідэмічны ўздым захворвання на грып 2023-2024 гадоў будзе абумоўлены цыркуляцыяй вірусаў грыпу А. Улічваючы дамінаванне віруса грыпу В папярэдняга эпідсезона і даныя глабальнага нагляду, можна меркаваць, што вірус грыпу В будзе цыркуляваць з меншай інтэнсіўнасцю, — адзначылі ў Міністэрстве аховы здароўя.

Сярод захварэлых будуць пераважаць дзеці да 14 гадоў. Рызыкують захварэць таксама цяжарныя і асобы старэйшыя за 65 гадоў, а таксама людзі, якія ўваходзяць у групу рызыкі развіцця захворвання і постгрыпозных ускладненняў.

Медыкі звярнулі ўвагу, што ў арганізацыях аховы здароўя працягваецца вакцынацыя.

Усе вакцыны зарэгістраваны і дазволены для прымянення на тэрыторыі Беларусі, яны змяшчаюць актуальныя штамы.

### ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ?

Спецыялісты рэкамендуюць выконваць шэраг мер, накіраваных на мінімізацыю рызыкі распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый:

• скарачайце да мінімуму час знаходжання ў месцах масавага збору людзей;

• выкарыстоўвайце сродкі аховы органаў дыхання (маскі, рэспіратары) пры немагчымасці захавання сацыяльнай дыстанцыі 1-1,5 м, калі ў вас рэспіраторныя сімптомы (насмарк, кашаль, чханне) або вы знаходзіцеся ў месцах масавага збору людзей;

• пазбягайце цесных кантактаў з людзьмі, якія маюць прыкметы рэспіраторнага захворвання;

• рэгулярна і старанна мыйце рукі з мылам, абавязкова пасля вуліцы і грамадскага транспарту. Выкарыстоўвайце пры неабходнасці антысептычныя сродкі;

• праводзьце рэгулярнае праветрыванне і вільготную прыборку памяшкання, у якім знаходзіцеся;

• прытрымлівайцеся здаровага, збалансаванага харчавання, фізічнай актыўнасці (часцей гуляйце на свежым паветры) і не забывайце пра паўнавартасны сон.

Пры з'яўленні сімптомаў рэспіраторнага захворвання (павышэнне тэмпературы цела, кашаль, насмарк, галаўны боль, боль у горле і іншае) неабходна заставацца дома і выклікаць урача.

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Обрезки согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1Z1Nkt-a2FufMCswHSBlHj3456v0sU1cj/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2 455,43 | 245,54 | 122,77 |
| 2 | Надгробная плита Балтик Браун, 0,48 м2; Надгробная плита Балтийский, 0,55 м2; Надгробная плита Покостовский, 0,24 м2; Тумба Покостовский, 0,21 м2; Тумба Покостовский, 0,19 м2; Тумба Покостовский, 0,14 м2; Мемориальный компл. Мансуровский, 0,5 м2; Мемориальный компл. Янцевский, 0,54 м2; Мемориальный компл. Янцевский, 0,07 м2; Цветник Балтик Браун, 0,69 м2; Крышка Габбро-Диабаз, 1,08 м2 | 1 631,89 | 163,19 | 81,59 |
| 3 | Плита Балтик Браун, 0,05 м2; Плита Балтик Браун, 0,2 м2; Плита Балтик Браун, 0,08 м2; Плита Балтик Браун, 0,24 м2; Плита Балтик Браун, 0,04 м2; Плита цокольная Покостовский, 0,84 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,56 м2; Плита цокольная Покостовский, 0,41 м2; Плита цокольная Покостовский, 0,2 м2; Плита цокольная Покостовский, 0,97 м2; Плита цокольная Покостовский, 2,62 м2; Плита цокольная Покостовский, 0,66 м2; Плита цокольная Покостовский, 1 м2; Плита цокольная Покостовский, 1,08 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,42 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,1 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,25 м2; Плитка облиц. Покостовский, 0,64 м2; Плита Покостовский, 0,16 м2; Плитка разнофор. Покостовский, 0,9 м2; Плитка разнофор. Покостовский, 1,08 м2; Плитка разнофор. Покостовский, 0,88 м2; Плитка разнофор. Покостовский, 0,94 м2; Плитка облиц. Покостовский, 1,2 м2; Плитка облиц. Покостовский, 3,47 м2 | 4 842,68 | 484,27 | 242,13 |
| 4 | Плитка облиц. Капустинский, 0,96 м2; Плитка разнофор. Капустинский, 0,9 м2; Плитка разнофор. Капустинский, 0,71 м2; Плитка мощения Капустинский, 1 м2; Плитка мощения Капустинский, 0,76 м2; Плитка облиц. Возрождение, 1,84 м2; Плита цокольная Возрождение, 1,08 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,18 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,06 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,91 м2; Плитка облиц. Возрождение, 0,96 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,85 м2; Плита цокольная Возрождение, 2,4 м2; Плита цокольная Возрождение, 0,86 м2; Плита цокольная Возрождение, 1,02 м2; Плита цокольная Возрождение, 1,02 м2 | 3 515,57 | 351,56 | 175,78 |
| 5 | Плита цокольная Балморал Ред, 3 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 1,79 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 0,66 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 1,14 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 0,46 м2; Плита цокольная Балморал Ред, 0,21 м2 | 2 266,06 | 226,61 | 113,30 |
| 6 | Плитка облиц. Аврора, 1,13 м2; Плитка облиц. Аврора, 0,19 м2; Плитка облиц. Аврора, 0,14 м2; Плитка мощения Аврора, 1 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,8 м2; Плитка облиц. Лабрадорит, 0,96 м2 | 1 497,24 | 149,72 | 74,86 |
| 7 | Плитка облиц. Мансуровский, 0,19 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 2,52 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,96 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 1,13 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 1,3 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,88 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 3,29 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,36 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,01 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 3,36 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 0,49 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 18,47 м2; Плитка облиц. Мансуровский, 2,11 м2 | 10 941,47 | 1 094,15 | 547,07 |
| 8 | Плита цокольная Янцевский, 1,06 м2; Плита цокольная Янцевский, 9,25 м2; Плита цокольная Янцевский, 0,93 м2; Плита цокольная Янцевский, 0,93 м2; Плита цокольная Янцевский, 0,91 м2; Плита цокольная Янцевский, 2,25 м2; Плита цокольная Янцевский, 0,45 м2; Плита цокольная Янцевский, 0,77 м2; Плита цокольная Янцевский, 1,02 м2; Плита цокольная Янцевский, 9,8 м2; Плита цокольная Янцевский, 4,43 м2; Плита цокольная Янцевский, 0,5 м2; Плита цокольная Янцевский, 1,67 м2; Плита цокольная Янцевский, 2,64 м2 | 6 149,47 | 614,95 | 307,47 |
| 9 | Плитка облиц. Янцевский, 0,76 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,27 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,048 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,84 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,75 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,83 м2; Плитка облиц. Янцевский, 1,5 м2; Плитка облиц. Янцевский, 8,16 м2; Плитка облиц. Янцевский, 0,84 м2 | 2 343,60 | 234,36 | 117,18 |
| 10 | Плита цокольная Мансуровский, 1,02 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,96 м2; Плита цокольная Мансуровский, 1,44 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,22 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,76 м2; Плита цокольная Мансуровский, 2,58 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,88 м2; Плита цокольная Мансуровский, 1,76 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,75 м2; Плита цокольная Мансуровский, 1,64 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,72 м2; Плита цокольная Мансуровский, 0,46 м2 | 4 113,76 | 411,38 | 205,69 |
| 11 | Блок Габбро-Диабаз, 0,53 м2; Блок Балморал Ред, 0,13 м2; Блок Балтик Браун, 0,61 м2; Блок Мансуровский, 1,17 м2; Брус Габбро-Диабаз, 0,14 м2; Брус Габбро-Диабаз, 0,14 м2; Брус Габбро-Диабаз, 0,15 м2; Брус Габбро-Диабаз, 0,14 м2; Брус Балтик Браун, 0,83 м2; Брус Возрождение, 0,92 м2; Брус Капустинский, 0,41 м2; Брус Возрождение, 0,61 м2; Брус Возрождение, 0,61 м2; Брус Балморал Ред, 0,3 м2; Брус Возрождение, 0,75 м2; Брус Межиричский, 1,7 м2; Брус Балтик Браун, 0,18 м2; Брус Габбро-Диабаз, 0,9 м2 | 3 536,66 | 353,67 | 176,83 |
| 12 | Плита Возрождение, 1,01 м2; Плита Янцевский, 2,08 м2; Плита Янцевский, 2,19 м2; Плита Балтийский, 0,6 м2; Плита Межиричский, 0,35 м2; Плита Межиричский, 0,69 м2; Плита Гранатовый амф., 0,24 м2; Плита Габбро-Диабаз, 0,2 м2; Плита Лабрадорит, 0,25 м2; Плита Межиричский, 0,22 м2; Плита Межиричский, 0,22 м2 | 1 464,17 | 146,42 | 73,21 |
| 13 | Борт Янцевский, 9,5 п. м; Борт Янцевский, 1,72 п. м; Борт Мансуровский, 12,1 п. м; Борт Микашевичский, 0,004 м2; Борт Микашевичский, 0,004 м2; Борт Габбро-Диабаз, 5,88 п. м | 2 402,74 | 240,27 | 120,14 |
| 14 | Слэб Балморал Ред, 3,28 м2; Слэб Габбро-Диабаз, 0,8 м2; Слэб Габбро-Диабаз, 0,5 м2 | 1 739,71 | 173,97 | 86,99 |
| 15 | Плитка облиц. Симоновский, 3,08 м2; Плитка облиц. Симоновский, 3,08 м2; Плитка облиц. Габбро-Диабаз, 1,08 м2; Плитка облиц. Ореховский, 0,66 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,32 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,18 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,16 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,14 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,64 м2; Плитка облиц. Межиричский, 0,32 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 0,41 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 0,23 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 0,3 м2; Плитка облиц. Балтик Браун, 1,02 м2; Плитка облиц. Глушковичский, 1,12 м2; Плитка облиц. Глушковичский, 1,24 м2 | 2 513,46 | 251,35 | 125,67 |
| 16 | Плитка мощения Глушковичский, 0,78 м2; Плитка мощения Глушковичский, 0,55 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,96 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,76 м2; Плитка мощения Возрождение, 0,49 м2; Плитка мощения, 1 м2; Плитка мощения Балтик Грин, 1,82 м2; Плитка мощения Микашевичский, 1,12 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,91 м2; Плитка мощения Микашевичский, 0,42 м2; Плитка мощения Глушковичский, 0,91 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,66 м2; Плитка мощения Мансуровский, 0,69 м2; Плитка мощения Балтик Грин, 0,6 м2; Плитка мощения Мансуровский, 1,2 м2; Плитка мощения Балтик Грин, 1,59 м2 | 3 587,95 | 358,80 | 179,40 |
